КОШТ НУМАРУ 5 кап.

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гадз.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА:

На 1 месяц	— р. 90 к.
„ 3 „	2 р. 70 к.
„ 6 „	4 р. — к.
„ 1 год	6 р. — к.
Зьмена адрэсу (пашпарт)	— 20 к.
Квітанцыя	— 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ:

За радок капіталу пасьля тэксту	— р. 50 к.
За радок капіталу наперад тэксту	1 р. — к.
За радок капіталу перад тэкстам	1 р. 50 к.

Абвесткі на 50 проц. дарожэй. Вялікія жырнасьці бяруцца 10 проц. кошту.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ:

За 1 дакумэнт	35 кап.
За кожны дадатковы	15 „
Тэлеграмы і тэлефонныя перадачы за дакумэнт	15 „
За кожны дадатковы	5 „

Публікацыі ЗАГСу—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА у канторы газэты, на ўсіх паштовых Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і на ўсіх пашт.-тэл. аддзелах.
АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

10 год выданьня — ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. — № 245 (2734) Пятніца, 25-га кастрычніка 1929 г.

Савгасныя і калгасныя партячэйкі—барацьбіты за генэральную лінію партыі, арганізатары сацыялістычнай рэканструкцыі.

Выступленьня тав. ВАСІЛЕВІЧА на ўсебеларускай нарадзе сакратароў ячэек КП(б)Б калгасаў і савгасаў.

Рашуча змагацца з ухіламі і прымірэнцтвам.

Таварышы! Вы пастаўлены на важнейшы і найбольш адказны вучастак сацыялістычнага будаўніцтва. У сваёй штодзённай працы вы знаходзіцеся ў акружэньні дробна-буржуазнай масы. Буржуазная, кулацкая частка вёскі актыўна выступае супроць сацыялістычнае перабудовы вёскі. У абставінах, у якіх вы працуеце, праца надта складаная і будзе ўскладняцца, бо чым далей, тым размах сацыялістычнага будаўніцтва будзе пашырацца, а клясавая барацьба абвастраецца і будзе на бліжэйшым этапе абвастрацца ў выніку нашага сацыялістычнага наступленьня на капіталістычныя элементы.

Вялікую ролю ў гэтай абстаноўцы адыгрывае сацыялістычны сэктар сельскае гаспадаркі. На камуністаў, якія працуюць у калгасах і савгасах, прыпадае вялікая адказнасьць. Вы ў сябе павінны злучыць дзьве якасьці—быць арганізатарам сацыялістычнае рэканструкцыі сельскае гаспадаркі і барацьбітом за генэральную лінію партыі. Мы ня можам праводзіць сацыялістычнага будаўніцтва без таго, каб ня весьці штодзённую барацьбу за генэральную лінію партыі. Калі-ж вы будзеце толькі па-дзеляцку падыходзіць да справы, вы ўпусьціце пытаньні клясавае барацьбы, барацьбы за генэральную лінію партыі, барацьбы з правымі ў тэорыі і на практыцы правага ўхілу, „левымі“ заскокамі, барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, шавінізмамі ўсіх масьцей і антысэмітызмам.

На сваёй працы вы сустракаецеся і з такімі «партыйцамі» і «камсамольцамі», якія супроць калектывізацыі, супроць сацыялістычнае перабудовы вёскі, і такімі, якія прымірэнча адносяцца да праяў правага ўхілу, або „левых“ заскокаў, беларускага нацыянал-дэмакратызму, усялякага шавінізму і антысэмітызму. Яны аб'ектыўна перашкаджаюць весьці барацьбу з нашымі клясавымі ворагамі, яны аб'ектыўна перашкаджаюць сацыялістычнаму будаўніцтву, і пагэтаму—самая рашучая барацьба в людзьмі, якія выяўляюцца насіцелямі такіх настрояў і прымірэнцтва, выяўляецца аднэй з асноўных нашых задач.

Кулак скарыстоўвае ўсе сродкі для барацьбы з партыяй, рабочай клясай, бядняцтвам і серадняцтвам, якое ідзе разам з беднатой. Ён, кулак, выяўляючыся адным з харчаваценяў антысэмітызму, шавінізмаў, нацыянал-дэмакратызму, карыстаецца як мага гэтымі сродкамі ў сваёй барацьбе супроць генэральнай лініі партыі, супроць савецкае ўлады, падмацоўваючы гэтыя сродкі тэрорам.

Трэба цьвёрда памятаць, што дзяляцкі падыход да працы—не бальшавіцкі падыход і сёньня выяўляецца асабліва шкодным. Сёньня той ня можа стаяць у партыйнага кіраўніцтва, хто не разумее, што ня можна складаць і выконваць пляны сацыялістычнага, у тым ліку калгаснага і савгаснага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, бяз шчыльнай увязкі з бязьлітаснай барацьбой з кулаком і нэпманам, усімі шавіністамі і ў першую чаргу на даным этапе з беларускімі нацыянал-дэмакратамі, антысэмітамі, бяз шчыльнай увязкі з бязьлітаснай барацьбой з правай апазыцыяй унутры партыі і „левымі“ заскокамі і прымірэнцамі да іх. Гэтую барацьбу ды будаўніцтва трэба весьці адначасова і рашуча. Усе гэтыя задачы складаюць непрарыўнае цэлае. Толькі ў штодзённай працы, вырашаючы ўсе гэтыя задачы, толькі мабілізуючы масы працоўных, арганізуючы іх актыўнасьць, карыстаючыся сацыялістычным спаборніцтвам, як мэтадам працы, разгортваючы ўнутры партыйную дэмакратыю і найшырэйшую самакрытыку, можна будаваць і пабудаваць сацыялізм.

Партыя арганізавала моцныя ўдары па правых ухілістых, антысэмітах, шавіністых, нацыянал-дэмакратах, глушыцелях, самакрытыкі, бюракратах і розных шкодніках. Але-ж харчовая база іх хаця і звужваецца ў выніку нашага сацыялістычнага наступленьня, але капіталістычныя элементы яшчэ не разьбіты да канца, яны, адчуваючы нязьбежнасьць паражэньня і гібелі, будуць актывізавацца, **а таму нам трэба трымаць адточаным аружжа барацьбы.**

Больш разгарнуць актыўнасьць, узмацніць выхаваньне мас.

Самакрытыка, сацыялістычнае спаборніцтва захапілі шырокія масы працоўных, але-ж таму, што гэта не кароткатэрміновая кампанія, а сродкі актывізацыі мас, добраякаснасьці працы і мэтад працы ў галіне сацыялістычнага будаўніцтва, трэба са ўсёй пільнасьцю і энэргіяй трымаць увесь час на вышыні шырока разгорнутаю самакрытыку і сацыялістычнае спаборніцтва.

Карныя мерапрыемствы не выяўляюцца асноўным мэтадам працы. Ленінскае марксыцкае выхаваньне па падставе штодзённай барацьбы—галоўная задача партыі і асноўны мэтад усёй работы. Падвышэньне культурнасьці, ведаў працоўных мас, у першую чаргу членаў партыі і камсамолу, інтэрнацыянальнае выхаваньне працоўных—гэта задачы, якія патрэбна вырашаць адначасова і ў шчыльнай сувязі з раней памянёнымі задачамі. Асабліва тэрмінова патрэбен рашучы пералом у справе інтэрнацыянальнага выхаваньня. На вырашэньне гэтай задачы ў сучасны час патрэбна накіраваць усю энэргію нашых апаратаў і саміх працоўных мас.

Партыйная арганізацыя Беларусі—здаровая, моцная, вытрыманая, бальшавіцкі загартаваная арганізацыя. Але-ж у арганізацыі ёсьць праслойка, праўда нязначная, недастаткова яшчэ бальшавіцкі закалённая. Гэта праслойка складаецца, галоўным чынам, з тых таварышоў, якія вышлі не з пралетарскага асяродзішча і якія нясуць на сабе груз нязжытых перажыткаў дробна-буржуазнага, нацыянальнага адраджэнчества. У нашых умовах, калі дробна-буржуазнае акружэньне вельмі моцнае, пытаньне бальшавіцкага выхаваньня членаў партыі, прэадаленьня паасобнымі сябрамі партыі перажыткаў іх дробна-буржуазнага мінулага да канца набывае актуальнейшае значэньне. Зразумела, пры гэтым адзінкі акажуцца безнадзейнымі, і іх трэба будзе адсеяць.

Пры абвостранай клясавай барацьбе, пры разгортваньні фашысцкіх арганізацый у Заходняй Беларусі, на чале якіх сталі беларускія нацыянал-дэмакраты, хістаньні паасобных членаў партыі зараз-жа скарыстоўваюцца клясавымі ворагамі ў нас і за межамі ў сваіх мэтах, для барацьбы з савецкай дзяржавай. Таму трэба помніць, што кожны крок адыходу ад генэральнай лініі партыі ёсьць дапамога буржуазеі. Трэба тым, хто не канчаткова заблытаўся, тэрмінова зрабіць належныя вынікі, яны павінны самі ўшчэнт разьбіць і рашуча асудзіць свае «тоорыі». Трэба хутчэй, а то позна будзе, выбіраць—ці ўдзельнічаць у будаўніцтве сацыялізму, ці аддаваць сябе на скарыстаньне буржуазеі.

У гэтай барацьбе за пабудову сацыялізму ў нашай савецкай краіне партыя павінна знайсьці ў вас адданых арганізатараў, будаўнікоў і барацьбітоў.

Дазвольце-ж пажадаць вам, таварышы, ад імя ЦК КП(б)Б, каб вы сваёй працай апраўдалі надзеі партыі і былі стойкімі арганізатарамі, барацьбітамі, энтузіястамі сацыялістычнае перабудовы вёскі.

Сёньня накіроўваецца першы эшалён бульбы пралетарыям Масквы.

Узмацнім далейшы тэмп загатовак.—Выканаем звыш нормы адгрузку чырвоных эшалёнаў бульбы Маскве і Ленінграду.—Шырока разгорнем працу па збору мяшкоў.

Першы эшалён.

Сёньня савгасы Менскай акругі накіроўваюць пралетарыям Масквы першы эшалён бульбы. Ня гледзячы на няспрыяючыя ўмовы працы, як дрэннае надвор'е, недахват тары, перавозачных сродкаў і несваечасовае фінансаваньне загатовак, рабочыя савгасаў з вялізарнейшым энтузіязмам узяліся за працу па перабіраньні і адпраўцы бульбы да чыгуначных станцый і дакладна вызначаны тэрмін зробілі адгрузку бульбы. Сваім уздымам рабочыя савгасаў даказалі, што інтарэсы рабочых Масквы і Ленінграду—інтарэсы агульна-пралетарскія і яны дорагі рабочым савгасаў БССР.

Першы эшалён бульбы Маскоўскім пралетарыям перадасьць спэцыяльная дэлегацыя рабочых з савгасаў БССР. Рабочыя і бядняцка-серадняцкія масы сялянства БССР ведаюць, якую вялізарную дапамогу нашай краіне аказваюць пралетарскія цэнтры на індустрыялізацыі і забясьпечаньню прамысловымі таварамі. Вось чаму рабочыя савгасаў нават ноччу, пры сьвятле кастроў, перабіраюць бульбу і адгружаюць, каб тэрмінова накіраваць пролетарыям чырвоных сталіц Савецкага Саюзу.

Асабліва пасьпяхова, в вялікім уздымам ідзе праца па перабіраньні і адгрузцы бульбы ў савгасе Сялец. У гэтым савгасе пры сьвятле кастроў ішла праца да глыбокай ночы. Ноччу праводзіўся таксама рамонт запаснага транспарту. Ноччу праводзілася адгрузка бульбы і савгасам Саламаранча. Усё гэта сьведчыць аб вялізарнай клясавай салідарнасьці працоўных БССР з пралетарыямі чырвоных сталіц.

Баявая гаспадарча-палітычная кампанія—загатоўка бульбы для чырвоных сталіц—ня ўсімі савецкімі органамі ўяўлена, як належыць быць. Напрыклад, на ст. «Беларусі», дзе грузіцца значная колькасьць вагонаў бульбы, адміністрацыяй чыгункі пададзены зусім неабсталяваныя і непадрыхтаваныя вагоны. У вагонах шмат сьмецьця, астаткаў вапны і г. д. Такія адносіны чыгункі да загатовак зьяўляюцца недапусьцімымі, і гэты недахват у далейшым павінен быць выпраўлен.

Трэба падкрэсьліць абсалютную непадрыхтаванасьць да такой важнай апэрацыі, як адгрузка і адпраўка бульбы, Плодацэнтру, які фактычна стаіць на чале загатоўкі. Плодацэнтр набраў зусім непадрыхтаваных агэнтаў, якіх паслаў на месцы. Ён яшчэ ўчора толькі стаў клапаціцца аб перавозе грошай на месцы, у той час калі на мясцох ужо шырока разгарнулася праца па пагрузцы бульбы ў вагоны.

Нельга абысьці моўчкі таксама манэўраў куладтва і падкулачнікаў, якія ўсімі мерамі імкнуцца зрываць загатоўкі. Кулакі і падкулачнікі за перавозку пуда бульбы на адлегласьць 13-14 кілёмэтраў хочуць атрымаць 20-25 кап. з пуда. Мясцовыя савецкія органы, партыйныя, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі павінны арганізаваць беднату і серадняцтва і даць рашучы адпор кулацкім махінацыям.

Ня гледзячы на перашкоды, якія сустракаліся на шляху арганізацыі эшалёну, ён сёньня накіроўваецца ў Маскву. Перадаючы першы эшалён бульбы, працоўныя БССР шчыра вітаюць пралетарыяў Чырвонай сталіцы.

Да ўсіх выканкомаў, гаспадарчых, дзяржаўных і каапэрацыйных установаў, грамадзкіх арганізацый і грамадзян БССР.

Зварот Урадавай камісіі і Наркамгандлю БССР па забесьпячэньню хлебазагатовак складамі і ліквідацыі транспартных цяжкасьцяй.

Улічваючы ўскладзенае ўрадам і партыяй на хлебазагатавіцеляў выкананьне гадавога пляну хлебазагатовак у працягу першага паўгодзьдзя і выцякаючыя адгэтуль цяжкасьці ў справе разьмяшчэньня гэтага хлеба, Урадавая камісія і Наркамгандлю БССР зварачваюцца да ўсіх выканкомаў, гаспадарчых, дзяржаўных і каапэрацыйных установаў, грамадзкіх арганізацый і грамадзян БССР прыйсьці на дапамогу хлебазагатавіцелям у справе падшуканьня складаў і збору тары і брэзэнтаў.

Урадавая камісія і Наркамгандлю зварачваюцца да ўсіх грамадзян, і асабіста да камсамолу („лёгкая кавалерыя“) з просьбай паведамляць мясцовым саветам, якія склады скарыстоўваюцца нямэтазгодна, а таксама аб памяшканьнях, якія могуць быць скарыстаны для хаваньня хлеба.

Усе ўстановы, прадпрыемствы і арганізацыі павінны прыняць усе меры да аслабаненьня маючыхся ў іх мяхоў здаўшы іх неадкладна Саюзхлебу.

Разам з савецкімі, каапэрацыйнымі і грамадзкімі арганізацыямі кожны грамадзянін БССР павінен адгукнуцца на гэты заклік і здаць маючыяся ў яго мяхі ва ўстаноўленую плату.

Урадавая камісія і Наркамгандлю ўскладаюць на Саюзхлеб арганізацыю паўсямеснага збору мяхоў ад насельніцтва, робячы за іх разьлікі са здатчыкамі, начыньку і неадкладнае накіраваньне гэтых мяхоў у пункты спажываньня іх.

Сіламі савецкай грамадзкасьці, сьвядомымі адносінамі кожнага грамадзяніна БССР да справы дапамогі хлебазагатоўкам,—тэхнічныя цяжкасьці, якія сустракаюцца на шляху іх разьвіцьця, будуць зьнішчаны і заданьне ўраду і партыі—да студзеня месяца скончыць выкананьне гадавога пляну хлебазагатовак—будзе выканана.

Урадавая камісія.
Наркамгандлю БССР.

Чырвоныя абозы з бульбаю.

У Менскім акруговым інспэктарыяце гандлю нашаму супрацоўніку паведамілі аб тым, што з шэрагу райёнаў паступаюць весткі аб значным пераломе ў галіне загатовак бульбы. Спажывецкая і сельска-гаспадарчая каапэрацыя свае заданьні па арганізацыі эшалёнаў бульбы ўжо выканалі.

Гэтымі днямі ў Менск з вакольных райёнаў прыбываюць цэлы шэраг буйных абозаў бульбы для перадачы Менскаму ЦРК і ваенведу. З Плешчаніц атрымана паведамленьне, што гэтымі днямі накіроўваецца ў Барысаў чырвоны абоз з 16 тысячамі пудоў бульбы. Сёньня накіроўваецца ў Маскву першы эшалён бульбы, які арганізаваны Белсельтрэстам.

* * *

22 кастрычніка г. г. сяляне Беладубраўскага с-с. Касьцюковіцкага раёну арганізавалі чырвоны абоз бульбы. Сялянамі здадзена 16 тысяч пудоў бульбы, якая накіравана ў Ленінград.

Здалі звыш 16 тыс. пудоў бульбы.

(АД НАШАГА МАГІЛЕЎСКАГА КАРЭСПАНДЭНТА).

20 кастрычніка ў Касьцюковіцкім райёне чырвонымі абозамі, арганізаванымі працоўным сялянствам Беладубраўскага сельсавету, здадзена звыш 16 тысяч пудоў бульбы дзяржаўным загатавіцелям.

Бульба ўжо накіравана ў Ленінград і Мурманск. Юр.

Пачалі варушыцца.

Загатоўку бульбы на Аршаншчыне вядуць: Дняпросаюз, Акрсельсаюз, Хлебасаюз, Пладацэнтр і „Прадуктпераработка“. Нядаўна складзен план, згодна якому на Аршаншчыне павінна быць загатоўлена 45045 тон бульбы. З гэтай колькасьці Наркамгандлю даў заданьне накіраваць у Ленінград 9000 тон. Гэта заданьне павінна быць выканана да 15 лістапада. Пакуль што яно выканана яшчэ зусім слаба. Загатоўлена бульбы толькі 3353 тоны, з якіх адгружана і накіравана 1937 тон. Астатняя частка загатоўленай бульбы падвозіцца і грузіцца. У першыя дні бульбазагатовак на ст. Ходасы адміністрацыя чыгункі не давала пад бульбу вагонаў з прычыны таго, што пагрузка яе ня мае першачарговай важнасьці. Патрабавалася тлумачэньне з боку Інспэкцыі Гандлю і тады чыгуначнікі пачалі даваць вагоны пад бульбу.

Пасьля таго, як быў складзен акруговы плян бульбазагатовак, акруговы камітэт партыі і акрвыканком паслалі ўсім райвыканкомам тэлеграмы, у якіх прапануецца давесьці гэтыя пляны да вёскі ў трохдзённы тэрмін і завастрыць увагу савецкай і партыйнай грамадзкасьці на бульбазагатоўках і пачаць падвозку бульбы арганізаваным парадкам праз чырвоныя абозы. Гэта павінна значна паскорыць бульбазагатоўкі і даць магчымасьць выканаць плян і заданьні Наркамгандлю да тэрміну.

Там, дзе пад бульбу патрэбны памяшканьні,—яны ўжо ёсьць, але ў значнай сваёй большасьці бульбазагатоўкі складаў не патрабуюць, бо бульба адразу в мейсцаў закупкі падвозіцца на чыгунку, грузіцца і накіроўваецца на месца прызначэньня.

28 і 29 кастрычніка з акругі мяркуецца накіраваць у Ленінград два чырвоныя эшалёны, адзін з якіх будзе накіраван сялянствам, а другі—выключна калгасамі акругі.

Усім райвыканкомам запрапанавана дапамагаць адпраўцы бульбы. Загатавіцелі павінны падаваць заяўкі на патрэбную колькасьць вагонаў за дзень да пагрузкі, каб нець магчымасьць іх без затрымкі атрымаць.

Дрэнна справа з разьлікам за адпраўленую бульбу. Разьлік затрымліваецца. Аб гэтым ужо даведзена да ведама Наркамгандлю, яму неабходна прыняць аднаведныя меры. Затрымак у адгрузцы і адпраўцы бульбы пакуль што няма. Вагоны падаюцца па першаму запатрабаваньню.

Дрэнна толькі тое ў кампаніі бульбазагатовак, што пляны ў раёне разасланы толькі нядаўна і іх давядзеньне да вёскі пачалося толькі з 22 кастрычніка. І хоць райвыканкомам разаслана тэлеграма аб выкананьні прапановы давесьці пляны да вёскі ў трохдзённы тэрмін, усё-ж такі за такі кароткі тэрмін гэта зроблена ня будзе, бо пакуль раёны давядуць пляны да сельсаветаў—пройдзе ня менш трох дзён, а пакуль сельсаветы да вёскі,—дык пройдзе і ўвесь тыдзень. Але калі сельсаветы добра возьмуцца за справу, дык пляны па бульбазагатоўкам будуць выкананы своечасова.

Ал. К.

Урадавы крызіс у Францыі.

Просьбы Брыяна аб часовым давер'і ўраду засталіся дарэмнымі.

ПАРЫЖ, 23-X. Урад быў скінуты галасамі радыкалаў, сацыялістаў, асобных рэспубліканскіх сацыялістаў, а таксама крайнім правым крылом, а гэта складала ўвогуле большасьць супроць ураду на 11 галасоў. Падзеньне ўраду зьявілася поўнай нечаканасьцю ня толькі для палітычных колаў, але і для саміх лева-буржуазных партый і сацыялістаў, якія галасавалі супроць ураду і ставілі сваёю мэтаю неадкладна скінуць урад.

Просьбы Брыяна выказаць давер'е ўраду перад Гаагай зазначыўшы, што заўчаснае абмеркаваньне пытаньняў аб эвакуацыі Рэйнскай вобласьці і Саарскай вобласьці і аб звыш-банку можа паставіць пад пагрозу надыходзячыя перамовы аб афармленьні гаагскіх прынцыповых згод, былі аднак дарэмнымі. Характэрна пазіцыя сацыялістаў. У часе спрэчак гэтая пазіцыя зьменьвалася некалькі разоў Спачатку яны заяўлялі, што сацыялістычная фракцыя не супярэчыць супроць патрабаваньня ўрадам адтэрміноўкі, а ў далейшым ходзе спрэчак сацыялістычная фракцыя пад нажымам радыкалаў зьмяніла сваю пазіцыю і заявіла, што будзе галасаваць за прапанову радыкалаў аб абмеркаваньні інтэрпэляцыі на замежнай палітыцы не пазьней 15-га лістапада. Гэтым сацыялісты ахвяравалі ўрад на падзеньне, фарсіраваць які яны не хацелі. Друк падкрэсьлівае, што вырашэньне крызісу будзе зацяжным.

* * *

ПАРЫЖ. У спрэчках у палаце дэпутатаў па пытаньні аб тэрміне абмеркаваньня інтэрпэляцый, пасьля якіх габінэт Брыяна падаўся ў адстаўку, ад імя кампартыі выступіў дэпутат Бэртон. Бэртон заявіў, што дэпутат Арты, які процізаконна трымаецца ў астрозе, пазбаўлен магчымасьці абгрунтаваць пададзеную ім інтэрпэляцыю аб прычынах катастрофы на авіё-заводзе ў парыскай валоціцы Сюрэнь і ня можа такім чынам выступіць на абарону інтарэсаў абраўшых яго сюрэньскіх рабочых. Далей Бэртон заявіў, што гэтага ня было нават у часы імпэрыі.

Думэрг распачаў перамовы аб складаньні новага ўраду.

ПАРЫЖ. Гавас паведамляе, што францускі прэзыдэнт Думэрг распачаў перамовы аб складаньні новага ўраду і радзіўся са старшынёю сэнату і палаты дэпутатаў.

Рэфармісцкія лідэры сарвалі забастоўку гарнякоў.

Бэльгійская кампартыя заклікае ўсіх гарнякоў аднавіць барацьбу пад яе кіраўніцтвам.

ПАРЫЖ, 23-X. Забастоўка бэльгійскіх гарнякоў у вугольным басэйне Арынаж сарвана рэфармісцкімі лідэрамі.

Забастоўка сарвана ў выніку розных манэўраў рэфармістаў, накіраваных да таго, каб прымусіць гарнякоў прынаць прынятую рэфармістамі пастанову мешанай пагоджваючай камісіі аб павялічэньні заработку толькі на 3-6 процантаў у той час, як рабочыя аднадушна патрабавалі павялічэньня заработку на 10 проц.

Пастанова аб спыненьні забастоўкі ўхвалена на скліканым рэфармістамі дэлегацкім сходзе, на якім удзельнічала каля 800 гарнякоў. Грузчыкі, якія распачалі стачку і праз увесь час былі на чале яе, на гэтым сходзе прадстаўлены вельмі слаба. Рэфармісты правялі сход у духу шалёнага пацкоўваньня на камуністаў і карысталіся адкрытым шантажам з мэтаю запужаць рабочых. Дэлегаты грузчыкаў у знак пратэсту супроць прыдушэньня забастоўкі, дэманстрацыйна пакінулі сход яшчэ перад галасаваньнем пытаньня аб прадаўжэньні забастоўкі.

Камуністычны орган „Драпо Руж“ ганьбіць гэтыя паводзіны грузчыкаў, зазначаючы, што яны павінны былі змагацца з рэфармістамі да канца і канчаткова выкрыць іх.

Грузчыкі, якіх у Арынажы налічваецца больш 3-х тысяч, рыхтуюцца аднавіць забастоўку. Бэльгійская кампартыя заклікае ўсіх гарнякоў не здавацца прадпрыемцам і рэфармірмістам і аднавіць барацьбу пад кіраўніцтвам кампартыі. Партыя заклікае гарнякоў выступіць згуртавана на надыходзячай заўтра дэманстрацыі.

Дзяржаве авантур пагражае развал.

АРМІЯ ЧАН-ФА-ГУЯ ІДЗЕ ПАХОДАМ НА ПРАВІНЦЫЮ ГУАНСІ. —МУКДЭНСКІЯ ДЗЕЯЧЫ НЯ ЗГОДНЫ З ПАЛІТЫКАЙ НАНКІНУ Ў СПРАВЕ АДНОСІН ДА СССР.

Чан-Фа-Гуй рыхтуецца да паходу на Гуансі.

ШАНХАЙ, 23-X. Не зважаючы на афіцыйныя паведамленьні аб тым, што жалезная дывізія Чан-Фа-Гуя была некалькі разоў разьбіта ўрадавым войскам, Рэйтэр паведамляе, што армія Чан-Фа-Гуя згрупоўваецца ў паўночнай частцы правінцыі Гуансі, недалёка ад мяжы з правінцыяй Хунань, і рыхтуецца да паходу на правінцыю Гуансі.

Агенцтва Сімбун Рэнго паведамляе, што сілы Гаміньцзюну, якія стаяць на фронце ўздоўж Луньхайскай чыгункі, заключылі кампрамісную згоду з камандуючым урадавымі сіламі правінцыі Хэнань генэралам Тан-Шэн-Чы.

Як паведамляюць у адказ на заклік манчжурскай ўлады безагаворачна стаць на бок Нанкіна, Ен-Сі-Шан адмовіўся зьвязаць сябе якой-небудзь партыяй і падцьвердзіў, што будзе захоўваць поўны нэйтралітэт.

Мукдэн намеран распачаць перамовы з савецкім урадам.

ТОКІЁ, 22-X. У Мукдэне адбылася канфэрэнцыя мукдэнскіх дзеячоў, у якой узялі ўдзел усе мукдэнскія генэралы. Мукдэнскія лідэры радзяцца ў сучасны момант у Мукдэне і схіляюцца да таго, каб ра пачаць незалежна ад Нанкінскага ўраду перамовы з савецкім урадам аб УК чыгунцы, у сувязі з тым, што Нанкінскі ўрад занят сучаснымі ўнутранымі падзеямі. Мукдэнскія лідэры лічаць таксама, што Мукдэнскі ўрад ня можа трымаць вялікай арміі на мяжы з прычыны набліжэньня зімы.

* * *

ПЭЙПІН, 24-X. Паведамляючы аб намеры мукдэнцаў распачаць непасрэдныя перагаворы з СССР, агэнцтва Рэйтэр зазначае, што на гэтым асабліва настайваў бірынскі губэрнатар Чжан-Цзо-Сян. На закрытай канфэрэнцыі, якая адбылася ў Мукдэне Чжан-Цзо-Сян зазначаў на поўны правал тых перагавораў, якія вёў з Масквой Нанкін. Зазначаючы, што мукдэнцам, відавочна, надаела цягаць каштаны з агню на нанкінцаў „Норт Чайна-Дэйлі Мэйл“ выказвае надзею, што перагаворы паміж Мукдэнам і Масквой пачнуцца ў хуткім часе і дадуць здавальняючыя вынікі ў вырашэньні пытаньня.

Налёт на памяшканьне савецкага консульства

ТОКІЁ, 24-X. Па паведамленьні агэнцтва Сін-бун-Рэнго, сёньня на памяшканьне савецкага консульства ў Харбіне быў зроблен паліцэйскі налёт. Арыштавана 5 савецкіх грамадзян. Вобыск працягваўся 4 з пал. гадзіны. Толькі пасьля нападу кітайская ўлада паведаміла нямецкага консула аб вобыску і арыштах, стараючыся атрымаць яго санкцыю. Нямецкі консул Штобэ, абураны нападам, мяркуе хутка склікаць нараду консульскага корпусу. Налёт зроблен на падставе «выкрыцьця камуністычнага загавору», прычым „заговорщыкі“ быццам хаваліся ў памяшканьні савецкага консульства, якое пасьля разрыву зносін з Кітаем, як вядома, было перададзена нямецкаму консульству.

Арыштавана паліцыяй 600 рыкшаў.

ПЭЙПІН, 23-X. Паліцыя арыштавала больш за 600 рыкшаў, абвінавачваючы іх ва ўзбуджэньні хваляваньня. Прафсаюз рыкшаў і ўсе яго аддзяленьні зачынены. Трамвайная кампанія пастанавіла спыніць трамвайны рух у горадзе, пакуль пэйпінская ўлада ня дасьць ёй гарантыі ў абароне яе ўласнасьці. У выніку ўчарайшых хваляваньняў прыведзена ў вядомасьць каля 70 трамвайных вагонаў. Страты трамвайнай кампаніі дасягаюць 400 тысяч даляраў.

Накіроўваем эшалёны ў Маскву і Ленінград.

На вестках, якія атрыманы ў Белкаапсаюзе, відаць, што ў апошні час на мясцох наступіў пералом у галіне загатоўкі бульбы. У бліжэйшыя дні чакаецца ўзмоцнены падвоз бульбы да чыгуначных станцый. У мэтах захаваньня бульбы ад псаваньня, на месцы дадзены самыя суровыя дырэктывы аб парадку яе хаваньня да пагрузкі ў вагоны.

З Рудзенску паведамляюць, што на станцыі загатоўлена замест 10 семнаццаць вагонаў для эшалёну, у Смалявічах таксама замест 20 вагонаў ужо загатоўлена 40. Атрымана тэлеграфнае паведамленьне з Віцебску, што па ініцыятыве калгаснікаў, рабочых савгасаў і прамысловасьці, а таксама бядняцка-серадняцкага сялянства 26 кастрычніка накіроўваюцца два чырвоных эшалёны па 60 вагонаў кожны ў Маскву і Ленінград.

У вязку з шпаркім разьвіцьцём загатовак адчуваецца недахоп сродкаў. Неабходна ў тэрміновым парадку адпусьціць мэтавыя крэдыты для забясьпечаньня аплаты падвозу бульбы.

26-га кастрычніка Белкаапсаюз супольна з іншымі арганізацыямі накіроўвае эшалёны бульбы ў Маскву і Ленінград. Тое, што патрэбна даставіць в боку спажывецкай каапэрацыі для арганізацыі гэтых эшалёнаў, будзе выканана ў тэрмін і нават з перавышэньнем.

З усіх округ паступаюць тэлеграфныя весткі, што падвоз бульбы набывае такі вялікі размах, што ёсьць небясьпека ў несваечасовай падачы вагонаў. Неабходна прыняць усе меры, каб вагоны для пагрузкі бульбы падаваліся своечасова.

Загатоўка бульбы разгортваецца

(Па тэлефону ад уласнага карэспандэнта).

Магілеў, 24-X. Па акрузе пачалася ўзмоцненая загатоўка бульбы. З Магілеву ў раёны выехала каля 50 чалавек для дапамогі ў разгортваньні кампаніі на мясцох.

Па нямоўных вестках за апошнія 2 дні калгассаюз загатовіў 32 вагоны бульбы, а сельска-гаспадарчая каапэрацыя загатовіла 33 вагоны і спажывецкая—25 вагонаў бульбы для адпраўкі ў Маскву і Ленінград.

Абураючыя факты антысэмітызму на ярцаўскай тэкстыльнай фабрыцы

Партячэйка і прафарганізацыі не змагаліся з праявамі антысэмітызму і шавінізму.

СМАЛЕНСК, 23-X. На буйным прадпрыёстве Заходняй вобласьці Ярцаўскай тэкстыльнай фабрыцы выкрыты абураючыя факты антысэмітызму.

У прадзільным аддзеле ўсіх работніц-яўрэек называлі ня інак як «жыдоўкамі». Рабілі гэтак ня толькі беспартыйныя, але і камсамольцы і камуністы.

Партыйная ячэйка прадзільнага аддзелу адносілася да антысэмітаў прымірэнча. Толькі нядаўна гэтая памылка была папраўлена ячэйкай і вінаватыя былі належна пакараны.

Аднак становішча на фабрыцы не палепшылася. У часе чысткі партыі ў камісію падаваліся такія запіскі: „Мы ня хочам хадзіць на сходы, бо камуністы перайшлі ў яўрэйскую веру“. Асабліва ганебны выпадак здарыўся ў швальнай майстэрні ЦРК. Калі з гэтай майстэрні была звольнена нейкая Сапажкова (дамаўласніца і песябра саюзу), дык 35 рабочых з казармы № 203 падалі ў праўленьне ЦРК заяву, у якой пратэстуюць супроць звальненьня Сапажковай і патрабуюць звольніць з вытворчасьці ўсіх яўрэяў.

У казарме № 203 жыве некалькі камуністаў і камсамольцаў, але пікетаж з іх не падумаў ужыць якія-небудзь захады ў сувязі з гэтым абураючым учынкам.

На фабрыцы назіраюцца такія-ж выпадкі варожых адносін да палякаў. Не зважаючы на гэта, ні партыйцы, ні прафсаюзныя арганізацыі фабрыкі не праводзяць у належнай меры барацьбы з антысэмітызмам і шавінізмам.

Чыстка ячэек КП(б)Б дапаможа згуртаванню шэрагаў партыі для далейшага сацыялістычнага наступу.

Дзякуючы разгорнутай пралетарскай самакрытыцы чыстка і праверка выявіла трацкістаў і склочнікаў у ячэйцы Лесбелу, бязьдзейнасьць, разлажэньне і гніль у ячэйцы Бедзяржгандлю.

Канчаткова аздаравіць ячэйку.

СЬМЕЛАЯ САМАКРЫТЫКА ВЫКРЫЛА ШМАТ НЕНАРМАЛЬНАСЬЦЯЙ.

(Да чысткі ячэйкі Белдзяржгандлю)

Белдзяржгандаль — адна з буйных устаноў БССР, а таму, рэч зразумелая, чыстка ячэйкі прыцягнула шмат рабочых і служачых па толькі свайго калектыву, а і іншых, асабліва з боку рабочых шчаціншчыкаў, у клюбе якога праводзілася гэта чыстка

Былі і гутаркі на чыстцы пра антысэмітызм, і дзякуючы чыстцы высьветлілася, што камсамолец Ціхапоўскі, які ўжо быў прапушчан Бюро ячэйкі ў партыю, аказаўся антысэмітам, бузацёрам.

Некаторыя паасобныя працаўнікі хварэюць на старую гнілую хваробу—п'янства (т. т. Лабанаў, Казінік і інш.).

Старшыня камісіі па чыстцы тав. Пэтэр у сваім заключным слове казаў, што многа яшчэ патрэбна, каб канчаткова аздаравіць ячэйку, каб канчаткова зьнішчыць і выкарчаваць тую гніль і разлажэньне, якія былі ў 1927 і 28 г. г.

А. Арскі.

НА ЧЫСТЦЫ.



Малюнак з натуры мастака **Кругера** спэцыяльна для нашай газэты.

Выяўлена праца ранейшых ячэек, ускрыты хваравітыя зьявішчы ў працы ранейшых 2-х ячэек у 1927 і 1928 гадох. Поўнае разлажэньне партыйных шэрагаў, п'янкі, распуста, сямейнасьць і пакрываньне.

Не зьвярталі ўвагі на работу самага апарату, ня ўнікалі ў сутнасьць эканартных і імпартных заданьняў, а займаліся склокамі, сваркамі. Прышлося назначыць датэрміновыя перавыбары, і сэкратаром ячэйкі быў абраны вельмі дабрадушны рабочы мэталёвец т. Лабзоў, які толькі што вышаў з Чырвонай арміі, і які ня мог утварыць лепшых умоў у працы. На яго ўплываў ранейшы асяродак, ён апынуўся сярод разлажэньня і гнілі і браў іншы курс у працы: ён стараўся, каб у ячэйцы быў „мір і цішыня", але гэта аказалася яшчэ горш, бо пачала распаўсюджвацца сямейнасьць, пакрываньне, якія вельмі балюча адбіваліся на працы апарату. Лабзоў любіць выпіць—душа на распашку; у той-жа час ён загадвае гаспадаркай, усім пазычае грошы, губляе грашовыя дакуманты і ў выніку—растрата, якую ён пасьля ў працягу двух гадоў выплачвае, зносячы амаль голад. Ён сумленны, але няўстойлівы, нерашучы, а таму і тут прышлося зноў назначыць датэрміновыя перавыбары, і сэкратаром ячэйкі быў абраны вылучонец т. Петрашэвіч.

Гэта ўжо было ў канцы 1928 г. У працы ячэйкі пачынаецца пералом, яна пачынае паступова аздараўляцца, але ненармальнасьці яшчэ ёсьць, старое яшчэ не адышло ў мінулае, нешта выпраўляецца, але ўсё гэта «вакол ды блізка», а сапраўднага аздараўленьня не адчуваецца.

Спрэчкі па дакладу сэкратара ячэйкі на чыстцы цягнуліся чатыры вечары, выступала 55 чалавек, гаварылі адкрыта, сьмела, падвялі пад бязьлітасную самакрытыку як працу ўсяго апарату, так і некаторых адказных працаўнікоў.

Праўда, сэкратар ячэйкі не адзін раз зварочваўся да рабкораў Белдзяржгандлю: „Пішэце, браткі, не зважаючы на асобы, я заўсёды буду вашым ярым абаронцам", але... ня пісалі.

На па пастанове праверкому распушчана бюро ячэйкі Лесбелу.

Замест дзелавой работы бюро займалася склокамі.

ТРАЦКІСТЫ, ЯКІЯ СТАЯЛІ НА ЧАЛЕ ЯЧЭЙКІ, ВЫКЛЮЧАНЫ З ПАРТЫІ.

22 кастрычніка скончыла работу праверачная камісія па праверцы і чыстцы ячэйкі Лесбелу. Да чысткі ячэйка зусім не рыхтавалася, у часе правядзеньня праверкі камуністы трымалі сябе пасыўна — гэта ў лепшых выпадках, а ў горшых—імкнуліся замазаць усе тыя хваравітыя зьявішчы, за якія ячэйка павінна была сурова адказваць. Але дзякуючы актыўнаму ўдзелу прымацаваных да ячэйкі на час чысткі рабочых і часткі служачых установы, камісія поўнасьцю выявіла твар ячэйкі і ўжыла шэраг захадаў для яе аздараўленьня.

На чале ячэйкі сакратаром быў трацкіст Гарачун, які ў мінулым годзе актыўна ўдзельнічаў у рабоце нелегальнай контрэвалюцыйнай групы трацкістаў: наведваў сходы гэтай групы і запасаўся трацкісцкай літаратурай. Будучы сакратаром ячэйкі, ён усімі сіламі імкнуўся перацягваць у партыю ідэалёгічна варожых партыі асоб і гэта яму ўдавалася. За час сакратарства Гарачуна прынята ў партыю 7 камсамольцаў, былых трацкістаў.

Калі праходзіла датэрміновая чыстка ячэйкі трацкалектываў мэбляўшчыкаў, Гарачун хваляваўся за лёс яго сяброў-трацкістаў, ён рэгулярна наведваў пасяджэньні праверкому і выступаў актыўным абаронцам іх.

Працуючы ў установе, гэты самы Гарачун увесь час падхалімнічаў перад адміністрацыяй, пакуль не дабіўся павышэньня па службе з тэхнічнага на адказнага працаўніка, у выніку гэтага з працаю на новай пасадзе не спраўлялася, як не адпаведны свайму прызначэньню.

Бюро ячэйкі замест дзелавой работы займалася склокамі. Ячэйка амаль ніякай работы ў установе не вяла і ўплыву на служачых ня мела. Абгаварваючы галоўнейшыя рашэньні партыі, ячэйка нічога канкрэтнага не намячала, а прымала іх „да ведама". Барацьбы з бюракратызмам, работы па аздараўленьню апарату ніякай не праводзіла. Ніякіх захадаў да разгортваньня самакрытыкі ня было ўжыта. Частка партыйцаў мела погляд на самакрытыку як на „нападкі і траўлю". Пры такім становішчы ячэйкі апарат Лесбелу значна засьмечан; і да гэтага часу працуюць там уласьнікі заводаў і іншы чужы элемэнт. У часе перавыбараў МК мела месца „провазглашэніе" беспартыйнымі супрацоўнікамі контрэвалюцыйнага лёзунгу: «мясцком без камуністаў». Ячэйка не надала гэтай вылазцы належнага палітычнага значэньня і абышла гэты факт маўчаньнем.

За ідэалёгічную няўстойлівасьць, прымірэнчыя адносіны да варожых праяўленьняў, бязьдзейнасьць у рабоце па пастанове праверкому бюро ячэйкі распушчана, члены бюро атрымалі суровае партспагнаньне, сакратар ячэйкі Гарачун выключан з партыі.

Гэта мерапрыемства праверкома кладзе пачатак аздараўленьню ячэйкі.

Я. І-н.

У Віцебскай партарганізацыі было зацішша самакрытыкі.

Закончыўся нечарговы аб'яднаны пленум Віцебскага АК і АКК КП(б)Б.

ПЛЕНУМ ПОЎНАСЬЦЮ ПРЫЗНАЎ ПРАВІЛЬНАЙ ПАСТАНОВУ ЦК І ЦКК КП(б)Б ПА СПРАВЕ АК І АКК КП(б)Б.

Адбыўся нечарговы аб'яднаны пленум Віцебскага АК і АКК КП(б)Б. Адным з галоўных пытаньняў, якія абгаварваў пленум, было пытаньне аб становішчы самакрытыкі ў Віцебскай партарганізацыі.

Як вядома, Віцебскі АК і АКК дапусьцілі грубую палітычную памылку ў справе доктара Гусінскага. Справа гэта ня была вывучана як сьлед, АКК і АК не заўважылі таго, што рабілася навакол гэтае справы за яе плячыма.

А там адбывалася тая клясавая барацьба, якая характэрна для рэканструкцыйнага пэрыяду. Сярод працэсаў, якія маюць месца ў шэрагах інтэлігэнцыі, у тым ліку і ўрачэбнай, у віцебскіх доктарскіх колах прамільгануілі антыграмадзкія моманты.

Не заўважыўшы гэтага, выхапіўшы справу Гусінскага ў голым выглядзе, Віцебская АК і АКК „наваліліся" на рэдакцыю газэты „Заря Запада" (зараз „Віцебскі Пралетары") і гэтым самым аб'ектыўна нанесьлі ўдар па самакрытыцы.

Падкрэсьліўшы бясспрэчнасьць грубай палітычнай памылкі з боку АК і АКК у справе Гусінскага, т. Арапштам, сэкратар акругкому КП(б)Б, які рабіў на пленуме даклад аб становішчы самакрытыкі, адзначыў, што памылка гэта зьявілася ў выніку **часовага зацішша на фронце самакрытыкі** ў Віцебскай партарганізацыі.

Самакрытыка ў партарганізацыі яшчэ недастаткова разгорнута, яна не знашла належнага водгуку у масах, не падхоплена сустрэчнай хваляй зьнізу.

У выніку гэтага ў 1929 г. выкрываецца тое, што магчыма было-б выкрыць куды раней. У 1928 г. адбылося павялічэньне хутароў па акрузе на 754 адзінкі. Арцелі „Плодоовощ", якая ў большасьці свайго складу налічвае ліцэнцаў і абкладзеных індывідуальным падаткам, аказвалася дапамога. У якасьці намесьніка старшыні АВК высоўвалася бяднячка-сялянка Багдановіч, якая аказалася жонкай бандыта.

Чыстка ячэйкі АКРЗА выкрывае моманты скрыўленьня клясавай лініі, бюракратызму, аб чым яшчэ вясной пісалася ў «Беларускім Батраку», але ня было зьвернута ніякай увагі.

Па прадпрыёмствах самакрытыка не разгорнута. На Мэтпроме на працягу шэрагу гадоў панавалі недапусьцімыя факты расходваньня заводзкай маемасьці—былі перавышэньні ў зарплаце, замест 2 з палов. кгр. фарбы трацілася 11. Ніхто з рабочых гэтага ня выкрыў, а выкрыла гэта РСІ пры абсьледваньні заводу.

На фабрыцы „Дзьвіна" маюць месца факты абходу мас замкнутым парадкам.

Чыстка ячэйкі працасьветы выкрыла шэраг адмоўных настрояў сярод настаўніцтва, якія ў свой час ня былі заўважаны.

Пытаньне аб становішчы самакрытыкі абгаварвалася на 3-х пасяджэньнях пленуму. Выказалася 46 таварышоў. У спрэчках гаварылася аб неабходнасьці ўзьвесьці хвалю самакрытыкі зьнізу; аб большым разгортваньні самакрытыкі на вытворчасьці па шляху спаборніцтва, узьняцьця працоўнай дысцыпліны; аб тым, што трэба больш рашуча весьці барацьбу з правым ухілам у практычнай працы і г. д.

Крызісу акруговага кіраўніцтва няма—вось касьцяк спрэчак. Ёсьць неадпаведнасьць форм і мэтадаў працы АК занатрабаваньням жыцьця. Неабходна перагледзець сыстэму працы, адшукаць новыя мэтады. Дробныя справы трэба зьняць з пасяджэньняў АК, перадаўшы іх на разгляд адпаведных фракцый савецкіх устаноў і райкомаў, адначасова ўзмацніўшы жывое кіраўніцтва.

Прызнаючы поўнасьцю правільнай пастанову ЦК і ЦКК КП(б)Б, пленум адзнэчыў, што памылка ў справе Гусінскага павінна паслужыць вурокам як для кіраўніцтва, так і для ўсёй партарганізацыі, на якім практычна правяраецца неабходнасьць сустрэчнай нізавой хвалі самакрытыкі, ня гледзячы на асобы.

Ул. Буслаў.

Запоўніць прарыў!

Клясавы фронт у справе індывідуальнага абкладаньня кулака прарваны.—Шмат кулацкіх гаспадарак яшчэ дагэтуль не абкладзена сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку.

НЕДААБКЛАДАНЬНЕ КУЛАКА І ПЕРААБКЛАДАНЬНЕ СЕРАДНЯКА ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ШКОДНЫМ УХІЛАМ АД ГЕНЭРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ.—У МЕНСКАЙ І ГОМЕЛЬСКАЙ АКРУГАХ КУЛАЦКІЯ ГАСПАДАРКІ НЯ ВЫЯЎЛЕНЫ.—ТРЭБА ВЫРАЎНЯЦЬ ФРОНТ.

За рашучы наступ на кулака.

Індывідуальнае абкладаньне сельска-гаспадарчым падаткам кулака—просты шлях для наступу на пазіцыі капіталу ў вёсцы. Практычнае правядзеньне гэтай важнай палітычнай кампаніі—экзамен для савецкага фінансаваньня апарату і нізавых партыйных арганізацый. Недавыяўленьне кулака, недаўчот яго прыбыткаў аб'ектыўна зьяўляюцца такім самым шкодным ухілам ад генэральнае лініі партыі, як і абкладаньне серадняка індывідуальным падаткам. Партыя і ўрад будуць жорстка біць і за правы ўхіл і за левыя заскокі ў практыцы с.-г. падатку.

Пакуль што экзамену мы ня вытрымалі. Па БССР меркавалася абкласьці індывідуальна ня менш 2 проц. усіх гаспадарак, г. зн. звыш 16 тысяч. Лічбу гэту ніяк нельга лічыць надмернай, бо шэраг фактаў паказвае, што сапраўдных кулакоў ёсьць больш. Але і мінімальная лічба ня выканана. На апошні час кулакоў па БССР абкладзена толькі 14,3 тыс., ці 1,8 проц. Не гаворачы ўжо пра палітычны бок справы (ён досыць ясны), адзначым, што і з фінансавага боку гэты недабор вельмі шкодны, бо, дзякуючы прагрэсіі абкладаньня тыя 14 тыс. кулакоў, якія ўжо абкладзены, плацяць да 24 проц. усяго падатку, а 16 тыс. заплацілі-б і ўсе 30 проц. Толькі Бабруйская, Магілеўская, Полацкая і Аршанская акругі далі мінімальныя лічбы, хаця і па іх засталося шмат недавыяўленых кулакоў. Тым больш гэта недавыяўленьне ў іншых акругах, асабліва ў Менскай і Гомельскай, бо першая замест 3 проц. дала 2 проц., а другая—замест 2 проц.—1,5 проц.

Спэцыяльнае абсьледваньне НКФ высьветліла тут шмат прыкладаў апартунізму і простага патураньня кулаку. У Самахвалавіцкім раёне кулакі Яцковы (з іх адзін—інспэктар РСІ, цяпер зьняты з працы) пад носам РВК трымалі 2-х батракоў, зрабілі фіктыўны падзел гаспадаркі і нават атрымлівалі льготы, хаця маюць 28 дзес. зямлі, 23 гал. жывёлы і каля 2000 р. неземляробскіх прыбыткаў. У Астрашыцка-Гарадзецкім раёне кулакі Цырулькевіч і Кондзер маюць 30 і 33 дзес. зямлі, трымаюць батракоў і сэзонных рабочых, а абкладаюцца як сераднякі; у Брагінскім раёне (Гомельшчына) не абкладзены індывідуальна ўласьнікі 2-х пастаўных млыноў (Шкут, Краўчэнка), гандляры і квотнікі, якія маюць па 13-20 дзес. зямлі, па 6-18 гал. жывёлы, сотні рублёў непрацоўнага прыбытку. Такі самы малюнак у Калінкавіцкім раёне, Мазырскай акр. (Лыс і Бігар). Наогул, па Мазыршчыне абкладзен індывідуальна толькі адзін з усіх папоў, якія маюць сельскую гаспадарку. У Церахоўскім раёне (Гомельшчына) некалькі папоў таксама абкладзены як сераднякі. У Талочынскім раёне (Аршаншчына) плацяць падатак па серадняцкіх нормах поп Елінеўскі і дзякан Місьнікаў. Палобных прыкладаў можна пералічыць сотні. Патураньне кулаку сустракаецца і ў акруговым апараце. Мазырская акруговая камісія скасоўвае індывідуальнае абкладаньне папа Мачульскага, а прэзыдэнт РВК пакідаецца без адказу; такую-ж „міласьць" атрымлівае ўласьнік млына—Гутман. Гомельская камісія скасоўвае індывідуальнае абкладаньне некалькіх уласьнікаў млыноў і кулака Новіка, які займаецца патаемным гандлем і з аднаго саду меў 1500 руб. прыбытку; Новік заплаціў с.-г. падатку 15 руб. Гомельскі інспэктар па с.-г. падатку Гладковіч дае РВК загад выпісаць акладны ліст як серадняку Бірану—вядомаму кулаку, які мае 25 дзес. зямлі, 27 гал. жывёлы і займаецца гандлем.

Больш таго. Некаторыя „разумнікі" дастукаліся да вызваленьня ад падатку „па беднасьці" яўна кулацкіх і заможных гаспадарак. У Калінкавіцкім раёне, Мазырскай акр. такім чынам вызвалены папы Чарняўскі і Шамоцкі і ўласьнікі млыноў Рудзенкі. У Чашніцкім раёне віцебскі акрфінаддзел выявіў наступных „беднякоў", вызваленых райкамісіяй: старшыню Асташаўскага сельсавету—Аксюту (14 дзес. зямлі, 3 гал. буйнай жывёлы), В. Саковіча (17 дзес. зямлі і 12 гал. жывёлы), Сярэбра (14 дзес. зямлі і 5 гал. жывёлы) і шэраг іншых. І побач з гэтых у Чашніцкім раёне абкладзены, як кулакі, некалькі гаспадароў, якія маюць па 4 дзес. зямлі, 1 каня і 1 карову, гэта значыць маламоцныя сераднякі.

Апартуністы ў справе с.-г. падатку кідаюцца на розныя хітрасьці. Закон патрабуе ня толькі абкласьці кулака індывідуальна, але і як сьлед улічыць яго прыбыткі. Прадугледжана падвышэньне абкладаемага прыбытку кулакоў да 75 проц. супроць звычайных норм. А па БССР сярэдняе падвышэньне абкладаемага прыбытку абкладзеных кулакоў складае толькі 37 проц. Магчымасьці скарыстаны толькі напалову. Пры гэтым Аршанская акруга дае падвышэньне на 28 пр., Віцебская—на 26 проц. У паасобных раёнах гэтыя лічбы зьнижаюцца яшчэ больш: Езярышчанскі раён—9 проц., Бешанковіцкі—15 проц., Нараўлянскі—18 проц., Тураўскі—20 проц., Клімавіцкі—20 пр. і г. д. Гэткая мізэрная надбаўка кулаку выглядае як зьдзек над задачамі індывідуальнага абкладаньня. Тут—яўная спроба падмяніць якасьць колькасьцю, змазаць дырэктывы партыі і ўраду. А паасобным кулаком пад відам індывідуальнага абкладаньня проста дадзены льготы. У Сенненскім раёне (Віцебшчына) уласьніку млына Нядвецкаму налічылі прыбытку 785 р. замест 2840 р., які вызначыў фінінспэктар; у выніку — недаабкладаньне на 600 руб. Другому ўласьніку млына з таго-ж раёну Каранеўскаму—налічылі замест 5400 руб. толькі 1450 руб. прыбытку і недаабклалі яго на 1200 руб. У Грэскім раёне (Меншчына) 12 кулакоў плацяць сёлета на 1050 руб. падатку менш, чым летась. У Вузьдзенскім раёне 60 кулакоў недаабкладзены на 2500 руб. У Калінкавіцкім раёне (Мазыршчына) прыбытак уласьніка млына Баярынава зусім не абкладзен. У Брагінскім раёне (Гомельшчына) кулак—дзякан Леляўскі плаціць па індывідуальным абкладаньні на 12 руб. менш звычайнага, а кулаку Машкоўскаму выключаюць з абкладаньня палову прыбытку ад воўначоскі.

Урэшце, спагнаньне падатку з кулакоў праходзіць незадавальняюча. Была пастанова ўраду, каб да 15 кастрычніка кулакі заплацілі ўвесь падатак. Між тым, па няпоўных вестках на 16 кастрычніка за імі заставалася звыш 300 тыс. недаімак, пры чым з 2200 недаімачнікаў панесьлі кару толькі 625. У Калодзішчанскім сельсавеце, Астр-Гарадзецкага р., ніводны кулак не заплаціў падатку ў тэрмін, а адзін з іх яшчэ меў нагласьць прасіць растэрмінаваньня. У Жлобінскім раёне старшыня сёльсавету на запытаньне, што ён зрабіў, каб спагнаць падатак з кулакоў, адказаў—„няма часу".

Пададзеныя (толькі найбольш выразныя) факты прымушаюць нас узьняць трывогу. Важнейшая палітычная справа—індывідуальнае абкладачьне кулака—пад пагрозай зрыву. Катэгарычны загад СНК—працягваць выяўленьне кулакоў—выконваецца надзвычайна марудна. Многія РВК абмяжоўваюцца рэзалюцыямі, абежнікамі, нічога канкрэтнага ня робяць, каб выправіць становішча. Тыя райёны, дзе дабіліся некаторых посьпехаў, часта зусім спынялі працу. Застаюцца да гэтага часу нявыпраўленыя памылкі індывідуальнага абкладаньня сераднякоў.

Неабходны рашучы пералом. Працу акруговага і райённага апарату па с.-г. падатку трэба ацэньваць па выніках індывідуальнага абкладаньня. Нельга абмяжоўвацца зьняцьцем з пасады 1-2 працаўнікоў, што дапусьцілі яўнае скрыўленьне клясавай лініі; павінны панесьці кару і тыя працаўнікі, якія „прамаргалі" кулака, праявілі бязьдзейнасьць, бо яны аб'ектыўна таксама скрыўляюць клясавую лінію. Трэба безадкладна арганізаваць агульную праверку працы акруговых камісій, выправіць усе памылкі адносна серадняка, аднавіць індывідуальнае абкладаньне няправільна-выключаных кулакоў, пільна праверыць падлік іх прыбыткаў. Да недаімшчыкаў-кулакоў трэба ўжыць рашучыя рэпрэсіі—продаж маемасьці, паказальны суд. Мінімальныя лічбы па індывідуальнаму абкладаньню можна і трэба выканаць ня толькі поўнасьцю, але і з лішкам. Для гэтага неабходна цалкам скарыстаць дапамогу беднаты, якая ў шэрагу мясцовасьцяў нават ня ведае, калі было праведзена індывідуальнае абкладаньне кулакоў. Зусім недапушчальна тое, што некаторыя партыйныя ячэйкі, замест дапамогі і кіраваньня, стаяць у баку ад гэтай справы. Напрыклад, Дудзіцкая ячэйка (Калінкавіцкі р.) ніводнага разу не абгаварвала індывідуальнага абкладаньня, ці Зенькавіцкая ячэйка (Вузьдзенскі р.) заяўляе, што розныя кампаніі зрываюцца кулакамі, а сама ня выявіла ніводнага з іх. Толькі пад кіраўніцтвам партыйных арганізацый і з дапамогаю беднаты апарат здолее выправіць усе памылкі і дабіцца належнага абкладаньня кулака.

М. К.

Рашэньне прэзыдыуму акрвыканкому, аб якім трэба пагаварыць.

Прэзыдыум Магілеўскага АВК няправільна вызваліў ад індывідуальнага абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам кулака Вішнявіцкага.

Амаль кожны дзень наша як цэнтральная, так і мясцовая прэса штурмуе правы правага ўхілу. Пад якім-бы соусам апошні не падносіўся, наша партыя са ўсёй бальшавіцкай рашучасьцю выкрывае яго і б'е па-бальшавіцку.

Шмат разоў як на партыйных, так і на рабочых сходах Магілеўская партарганізацыя абгаварвала пытаньні сутнасьці правага ўхілу і патрэбы рашучай барацьбы з праявамі правага ўхілу і прымірэнцтвам да яго ў штодзённай практычнай працы. Прынята шмат рэзалюцый, якія цалком накіраваны да падтрыманьня генэральнае лініі партыі. Усюды, дзе толькі магчыма, магілеўцы дралі і дзяруць горла за выразную клясавую лінію, а Акрвыканком на практыцы сваёй работы дапусьціў надзвычайна буйную палітычную памылку, якая цалком накіравана на прымірэнцтва з правым ухілам.

А цяпер застановімся на канкрэтным факце і разгледзім, ці будзе гэта праяўленьне з боку Прэзыдыуму Акрвыканкому правага ўхілу, ці гэта так сабе што.

Падаю факт. Прэзыдыум Акрвыканкому на сваім пасяджэньні ад 3 кастрычніка 1929 г., разам з іншымі пытаньнямі, разглядаў хадайніцтва гр. гор. Магілева Вішнявіцкага Петрака і сына яго—гэроя ордэну „Чырвонага Сьцягу"—Мікалая Вішнявіцкага аб аслабаненьні гаспадаркі Вішнявіцкага Петрака ад індывідуальнага абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам. Дакладваў прэзыдыуму АВК гэтую справу т. Малашонак (старшыня акрвыканкому).

Нарэшце, справа ня ў тым, хто гэтую справу дакладваў. Адна справа далажыць, і зусім другая—вырашыць яе, а вырашаў гэтую справу прэзыдыум акрвыканкому, які на гэты раз складаўся выключна з членаў партыі.

Як-жа яны гэтую справу вырашылі? А вось як. Падаю дасло́ўна: Заслухаўшы хадайніцтва сына Петрака Вішнявіцкага—Мікалая Вішнявіцкага, гэроя ордэну „Чырвонага Сьцягу", знаходзячагася на адказнай вайсковай працы, аб аслабаненьні яго бацькі Петрака Вішнявіцкага ад індывідуальнага абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам і прымаючы пад увагу рэвалюцыйныя заслугі прасіцеля Мікалая Вішнявіцкага перад Савецкай краінаю і Чырвонай арміяй і тое, што Пятрок Вішнявіцкі добрахвотна адмовіўся (таму, што яго сына выганяць з шэрагаў арміі) ад уласнага свайго дому і аднаго гэктару заліўной сенажаці з перадачай іх у карысьць Магілеўскага Гаркамгасу,—лічыць, што ў сувязі з вышэйпаказаным хадайніцтва Міколы Вішнявіцкага заслугоўвае ўвагі і 1) гаспадарку Петрака Вішнявіцкага ад індывідуальнага абкладаньня аслабаніць, 2) прапанаваць Магілеўскаму Гаркамгасу прыняць ад П. Вішнявіцкага ў сваё веданьне дом і адзін гэктар заліўной сенажаці".

Вось і ўсё, што пастанавіў па гэтай справе Акрвыканком.

Цікава ведаць, няўжо-ж рэвалюцыю рабілі для таго, каб „прымаючы пад увагу рэвалюцыйныя заслугі" Мікалая Вішнявіцкага, аслабаніць яго бацьку кулака ад індывідуальнага абкладаньня с-г. падаткам, узяўшы пад увагу тое, што гэты кулак падачкаю свайго аднаго дому і гэктару сенажаці патрапіў надзвычайна лоўка выкруціцца з групы кулакоў.

Не, таварышы акрвыканкомаўцы, не для гэтага партыя і савецкая ўлада ахвяравала сваімі лепшымі барацьбітамі і змагарамі за справу заваёў пралетарыяту вялікага Кастрычніка, каб цяпер, напярэдадні сьвяткаваньня 12-й гадавіны Кастрычніка, пад рознымі прычынамі ўмацоўваць капіталістычныя элемэнты ў вёсцы.

Ніхто ня зьбіраецца зьмяншаць заслугі перад рэвалюцыяй т. Вішнявіцкага Мікалая—яны ў яго ёсьць. Гэта бясспрэчна. Мы іх цэнім, але-ж гэтыя заслугі мае Мікалай Вішнявіцкі, а не яго бацька—кулак Пятрок Вішнявіцкі.

Прыходзіцца проста зьдзіўляцца, як гэта магло здарыцца, што гэрой ордэну „Чырвонага Сьцягу", які ў сучасны момант займае адказную вайсковую пасаду, уступіўся ў абарону свайго бацькі-кулака. Я на ўсе сто процантаў упэўнены у тым, што гэтую махінацыю з домам і адным гэктарам сенажаці кулак зрабіў толькі па савету свайго сына Мікалая Вішнявіцкага. Апошні замест таго, каб парваць усякую сувязь з сваім бацькам-кулаком, шукае лазейку і ён яе знайшоў. Ён патрапіў абмануць савецкую ўладу, за якую калісь-ці сам-жа змагаўся.

Прэзыдыум Акрвыканкому санкцыянаваў гэтую махінацыю і гэтым самым дапусьціў буйную палітычную памылку. Ён прымірэнча аднёсься да наступленьня на кулацкі элемэнт.

Няўжо-ж Магілеўскаму акрвыканкому невядомы рашэньні партыі наконт бязьлітаснай барацьбы з праявамі правага ўхілу, а калі невядомы, то я пастараюся вам напомніць з рашэньняў XII зьезду КП(б)Б кароценькую вытрымку. Вось яна: „XII зьезд КП(б)Б даручае Цэнтральнаму Камітэту партыі і **заклікае усю партыю** яшчэ больш узмацніць у далейшым работу па выяўленьні і выкрыцьці ўхілаў ад ленінскай лініі, сканцэнтроўваючы галоўную, асноўную ўвагу **на правым ухіле і прымірэнцтве з ім**, як на галоўным ухіле, галоўнай небясьпецы, як на менш выкрытым ухіле для партыі на даным этапе сацыялістычнага разьвіцьця, не паслабляючы барацьбы з «левымі» хістаньнямі ў партыі (у бок трацкізму)". Вось што сказаў XII зьезд КП(б)Б наконт правага ўхілу і прымірэнчых адносін да яго.

Рашэньне прэзыдыуму акрвыканкому якраз накіравана ў адваротны бок. Гэтаю пастановаю АВК і адбіў прымірэнчыя адносіны да правага ўхілу.

Трэба будзе гэтую пастанову Магілеўскага акрвыканкому адмяніць і зацікавіцца, чым-жа усё такі было выклікана вынясеньне такога рашэньня.

Сергей Л-сеў.

КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ САВЕЦКАЙ КУЛЬТУРЫ.

1928-29 год—першая адзінка пяцігодкі—зрабіўся для народнае гаспадаркі годам крутога пералому, разгорнутага руху на новых шляхох рэканструкцыі. **1929-30 год павінен ады граць гэтую-ж ролю для культурнага фронту.**

Востра павялічыць колькасьць пісьменных, падрыхтаваць масавы пераход да ўсеагульнага навучаньня, пачаць ліквідацыю разрыву паміж патрэбамі краіны і наяўнымі кадрамі інжынэраў, тэхнікаў, аграномаў, высока ўзьняць масавую культпрацу, перабудаваць формы і мэтады, узьняць якасьць, пранізаць усю дзейнасьць культурных устаноў і прадпрыемстваў выразным клясавым зьместам—асноўныя задачы году, ударныя вучасткі культурнага будаўніцтва.

У 1929-30 годзе намечана навучыць грамаце 7 міліёнаў 500 тысяч чалавек--у тры разы больш леташняга. Ліквідаваць няпісьменнасьць усіх рабочых і палавіны сялян аграмаджанага сэктару—задача году.

Мэтады прыцягненьня грамадзкасьці (вопыт Саратава і Бауманскага раёну Масквы) павінны атрымаць шырокае распаўсюджваньне.

Усеагульнае пачатковае навучаньне да канца пяцігодкі павінна быць разгорнута поўнасьцю. Контрольныя лічбы 1929-30 году намячаюць тут востры пералом.

Калі ў леташнім годзе кантынгент ахопленых пачатковай школай павялічыўся на 4 проц. адносна 1929-30 г., колькасьць школьнікаў—на 390 тысяч, а асыгнаваньні склалі 428 міліёнаў руб., дык сёлета намечан рост кантынгенту на 16 проц. (1 міліён 600 тысяч новых школьнікаў), а бюджэт пачатковае школы вырастае да 655 млн. руб. (на 50 проц.)

Сярэдняя школа (7-9-10 - годкі) колькасна расьце нязначна (на 3,9 пр.) Вялікі рост сярэдняе школы адбудзецца праз некалькі год, калі мы вырашым больш актуальныя задачы ліквідацыі няпісьменнасьці, увядзеньня ўсеагульнага **пачатковага** навучаньня і падрыхтоўкі кадраў спэцыялістаў.

Аднак, перад сярэдняй школай стаяць **вялізарныя** якасныя задачы. Яна павінна зьмяніць свой твар. Палітэхнізм павінен быць укаранён у школе.

Падрыхтоўка кадраў сярэдняй і вышэйшай кваліфікацыі зьяўляецца **цэнтральнай**, важнейшай палітычнай работай культурнага сэктару ў бліжэйшым годзе.

Дэфіцыт у 11,1 тысяч індустрыяльных і 18,3 тысяч сельска-гаспадарчых спэцыялістаў застаецца, ня гледзячы на ўсё напружаньне.

Тым большыя сілы трэба накіраваць на вырашэньне праблемы кадраў.

Перападрыхтоўка ня менш 25 проц. спэцыялістаў-практыкаў, значнае павялічэньне колькасьці камандыруемых за граніцу, павялічэньне ў тры разы колькасьці вучняў, уцягнутых у бязупынную вытворчую практыку, разгортваньне сеткі спэцыяльных курсаў для падрыхтоўкі ў ВТУЗ'ы рабочых і іх дзяцей, перабудова праграмы і навучальных плянаў, павышэньне матар'яльнага ўзроўню студэнцтва і настаўніцкага пэрсаналу,—вось шэраг найбольш значных мерапрыёмстваў, якія павінны паблізіць вырашэньне задачы, мерапрыёмстваў, якія праводзяцца побач з новым будаўніцтвам. У выніку—да канца 1929-30 году **кадры інжынэраў** у прамысловасьці **вырастуць на 21 проц.** у колькасьці, якая пакідае далёка ззаду ўсе леташнія лічбы.

Пабудова новых 81 тэхнікумаў і 53 аддзяленьняў пры існуючых тэхнікумах павінна забясьпечыць выкананьне заданьняў пяцігодкі ў самым хуткім часе.

Фінансаваньне ўсіх гэтых мерапрыёмстваў складзе 119 млн. руб. па лініі вышэйшай школы, 66,8 млн.—па лініі тэхнікумаў. Гэта ў **два і ў тры разы** больш леташніх асыгнаваньняў.

Ня менш значныя зрухі намечаны і ў галіне падрыхтоўкі выкваліфікаваных рабочых. Да 500 тысяч рабочых пройдзе праз сетку розных курсаў, да 85 тысяч павялічыцца колькасьць вучняў школ ФЗУ (на 25 проц. больш леташняга году).

Побач з індустрыяльным усё большае значэньне пачынаюць набываць **сельска-гаспадарчыя кадры.**

Паколькі задача падрыхтоўкі кадраў спэцыялістаў новага тыпу можа быць ажыцьцёўлена толькі ў працягу шэрагу год, побач з будаўніцтвам новых вузаў і тэхнікумаў, перабудовай сыстэмы сельска-гаспадарчай асьветы павінна быць разгорнута **магутная сетка каротнатэрміновых курсаў падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі.**

У 1929-30 годзе гэтая сетка павінна ахапіць і падрыхтаваць: 100.000 кваліфікаваных рабочых, 40.000 трактарыстаў і рулявых, 25.000 кіраўнікоў калгасаў, 2.000 тэхнікаў, 3.000 аграномаў, 300 аграномаў вышэйшай кваліфікацыі, 400 мэханікаў-інжынэраў, 375 кіраўнікоў савгасаў, буйных калгасаў, машынатрактарных станцый. Вось наметкі ў галіне падрыхтоўкі кадраў. Яны ствараюць **сапраўдны пералом** і разгортваюць такія тэмпы, якія павінны забясьпечыць—чым далей, тым болей—посьпехамі росту сацыялізму.

Масавая культурная работа ў горадзе і вёсцы—самы шырокі вучастак культурнага фронту.

Ажыцьцёвіць гэтыя задачы заклікана разгаліненая, магутная масавая сетка.

Колькасьць хат-чытальняў вырастае з 22.000 да 25.500, клюбаў з 6.500 да 6.800.

Аграмадны рост намечан па радыё: з 671 тысячы ўстановак—да 2 міліёнаў 600 тысяч.

Сетка кіноўстановак вырасла за леташні год з 8.350 да 12 тысяч. Гэтую сетку пастаноўлена падвоіць: 23 кіноўстановак, з іх 11.000 перасовак--аграмадная моц прапаганды, агітацыі і выхаваньня.

Газэты павялічваюць свае тыражы (гадавыя) з 2.500 міліёнаў да 4.000 міліёнаў.

Кніжная прадукцыя (у міліён. друкаваных аркушоў) узрастае з 2.400 да да 3.370.

Мы ня спыняемся на шэрагу пытаньняў па сутнасьці работы ўсіх гэтых масавых формаў.

Па шэрагу буйнейшых галін культурнага сэктару **1929-30 г. павінен стварыць пералом.** Поўны абхват дарослых рабочых школамі ліквідацыі няпісьменнасьці, шырокае разгортваньне сеткі п

ЗА КЛЯСАВА-ВЫРАЗНУЮ ЛІНІЮ У КРЭДЫТАВАНЬНІ.

Шырэй разгорнем актыўнасьць бядняцка-серадняцкіх мас у працы сельска-гаспадарчай каапэрацыі, накіруем актыўнасьць на барацьбу з крэдытаваньнем кулакоў, на правільнае скарыстаньне фондаў каапэраваньня.

Таварыства крэдытавала заможнікаў.

Чырвона-Бярэскае крэдытнае таварыства ў сваёй працы ня мела выразнай клясавай лініі. Установукі на каапэраваньне беднаты і поўнага яе абслугоўваньня ня было. Аб гэтым сьведчаць хаця-б такія лічбы, што фонд каапэраваньня беднаты застаўся нявыкарыстаным напалову.

Пры каапэраваньні беднаты Жоўтак Станіслаў, які абкладзен падаткам у індывідуальным парадку, аказаўся каапэраваным за грошы фонду беднаты.

Таварыстам выдаваліся крэдыты з наступовым павышэньнем у залежнасьці ад павышэньня маемаснага становішча пазычніка. Крэдыты таксама выдаваліся індывідуальна абкладзеным, прычым за заможнікамі дапушчана і значна большая доля пратэрміновак.

Характэрным зьяўляецца той факт, што заможным пазычнікам крэдыт выдаваўся на такія мэты, як прывод да малатарні, калёсы і г. д. Ёсьць нават выпадкі скарыстаньня пазык на куплю гармонікі, на лячэньне...

Вельмі і вельмі нядбайна адносілася праўленьне да сваіх пратэрміновак. На працягу апошняга паўгодзьдзя пратэрміноўкі павялічылася на 100 проц., прычым справы пратэрміноўшчыкаў не перададзены ў суд.

У дапаўненьне да ўсяго гэтага прыходзіцца дадаць яшчэ і тое, што крэдытнае таварыства ня выканала дырэктыў аб выдачы крэдытаў беднаце на льготных умовах (ня больш 4 проц. ў год). Гэта яшчэ раз пацьвярджае няправільнасьць тэй клясавай палітыкі, якую праводзіла таварыства ў сваёй працы.

А. Д.

Фонд каапэраваньня беднаты не скарыстаны.

З паступовым павялічэньнем прыбыткаў сельска-гаспадарчых крэдытных таварыстваў павялічваецца фонд каапэраваньня беднаты. Сыстэмай Мазырскай сельска-гаспадарчай крэдытнай каапэрацыі выдзелена ў 1928-1929 г. звыш 12.000 руб. у фонд каапэраваньня беднаты. Але з вялікімі цяжкасьцямі прыходзіцца скарыстоўваць гэтыя сродкі, з прычыны недастатковай увагі часткі нізавых каапэрацыйных работнікаў да каапэраваньня беднаты і бяздзейнасьці большасьці раённых і сельскіх камітэтаў узаемадапамогі ў гэтай справе. Ёсьць работнікі, якія разглядаюць каапэраваньне беднаты як асобнае мерапрыёмства, якое ня зьвязана з абвастронай клясавай барацьбой. Па апошніх вестках не скарысталі да гэтага часу фондаў каапэраваньня беднаты: Мелешкавіцкае с.-г. крэд. т-ва—293 руб., Танежскае—297 руб., Тульгавіцкае—257 руб. Праўда, віноўныя ў нескарыстаньні прыцягнуты да адказнасьці, але на гэтым супыніцца нельга.

Трэба агульнымі сіламі праверыць працу ўсіх таварыстваў у гэтым напрамку.

„Каапэрацыйныя парадкі".

У мястэчку Талочына, Аршанскай акругі ёсьць буйнае спажывецкае таварыства з многімі адхіленьнямі, прыказчыкамі і загадчыкамі. Людзей у таварыстве многа, а толку мала. Прывезенага тавару кожны прыказчык хапае сабе. Ёсьць выпадкі, калі на квітках, аплочаных у касе, прыпісваюць тавараў на суму большую, чымся заплачана. Такую спробу утварыў вучань Талочынскай самігодкі Алесь Карота, які за адну банку гуталіну заплаціў 15 к., замест капеек паставіў рублі і узяў у прыказчыка гарнітур.

У выніку такой працы Талочынскае спажыв. т-ва мае растрату звыш 3-х тыс. р.

Неабходна каму належыць узяцца за справу гэтага т-ва.

К.

Жалезнай мятлой па Пташынскім.

Загадчык крамы Ленінскага спажывецкага т-ва Пташынскі Ульян растраціў у 1926 г. 200 руб. каапэрацыйных грошай. За гэта яго судзілі паказальным судом. Між іншым ён і зараз знаходзіцца на гэтай пасадзе і кіруе справамі каапэрацыі, робіць усё па свайму погляду. Адносіны яго да пайшчыкаў грубыя. Дэфіцытны тавар ён выдае сваім знаёмым, у большай колькасьці ранейшым сябрам праўленьня каапэрацыі, якія таксама растрацілі каапэрацыйныя грошы. Цёплая кампанія на чале з гэроем Пташынскім ладзіць п'янкі. Пташынскі здзекуецца над бедняком. Калі зварочваецца бядняк за мануфактурай, дык загадчык кажа: «Ты-ж лічышся ў сьпісах на атрыманьне хлеба, значым табе мануфактура". За шэсьць месяцаў у каапэрацыі пабылі шэсьць старшынь, а таму Пташынскаму лепш рабіць розныя махінацыі сумесна з ленінскімі нэпманамі. Час ужо ачысьціць Ленінскую каапэрацыю ад такога гэроя.

Сельнор.

Хто ў гэтым вінаваты.

У складзе праўленьня і ў рэвізійнай камісіі Вузьлянскага сельска-гаспадарчага т-ва па адному камуністу, але апошнія „ня ведалі", што старшыня праўленьня Левін рабіў, ня цікавіліся мусіць працай т-ва.

Трэба думаць, што і райённыя арганізацыі таксама меркавалі, што „на шыпке ўсё спакойна" і ня трывожылі т-ва. Нельга лічыць дастатковым кіраўніцтва РВК.

У т-ве ўжо больш году заблытана рахункаводзтва. Аб гэтым ведала праўленьне, рэвізійная камісія і інструктар саюзу Акаловіч. Апошні быў атакаваны ў т-ве публічна з боку рахункавода Шаршнёва, але відаць не адважыўся весьці барацьбу далей у галіне выпраўленьня яго памылак у рахункаводзтве. Інакш не зразумеем тое, чаму Шаршнёў, будучы зьнятым з працы ў Вузьлянскім т-ве, зноў пападае на сталую бухгальтарскую працу ў Янушкаўскае сельска-гаспадарчае т-ва.

Т-ва практыкавала выдачу пазык гаспадаркам, якія індывідуальна абкладзены, крэдытавала вялікімі сумамі ранейшых гандляроў, пад выглядам кароткатэрміновых пазык. Пры гэтым процанты браліся старшынёю па яго „жаданьню". Заўважаны выпадкі выдачы селянам бедняком кароткатэрміновых пазык на вытворчыя мэты, што кажа аб некаторым закабаленьні іх, бо бедняку пагражаць гэткія пазыкі цяжка.

Убой жывёл праводзіўся без складаньня актаў і самімі мясьнікамі накіроўваўся ў Менск. Ня было нагляду за працай скабяной крамы. Крамнік ня ведае цьвёрда расцэнак на тавары. Дагэтуль існуе думка, што цэны браліся, якія толькі жадаў крамнік. Аб фактурах, ці расцэнках сяляне нічога ня ведаюць, бо яны ляжаць у століку крамніка.

Хто-ж вінаваты ва ўсім гэтым?

На мой погляд, павінна ў першую чаргу адказаць мясцовая партячэйка і тыя камуністы, якія вылучаны на працу ў каапэрацыі, а таксама і адпаведныя райённыя партыйныя і савецкія органы, якія павінны былі сачыць за працай данага т-ва.

А. Б.

Вылучэнцаў судзяць

Загадчыка гандлёвай часткі Мазырскага акрсельсаюзу тав. Рашала і былога функцыянала па мясных апэрацыях тав. Фрыдмана адначасова 16-га кастрычніка судзілі па 202 арт. КК.

Судзілі іх за вываз жывёлы ў Ленінград пасьля забароны гэтага акргандлем і за дапушчаны ажыятаж на мясным рынку праз скарыстаньне агэнтаў некалькіх відаў каапэрацыі для загатоўкі жывёлы на адным кірмашы.

Суд высьветліў, што Мазырскаму акрсельсаюзу было дазволена Наркамгандлем БССР вывезьці ў Ленінград 75 тон жывёлы, а акргандаль забаронілі пазьней. Акрсельсаюз, у сваю чаргу, даў распараджэньне с.-г. крэдытным таварыствам аб забароне вывазу жывёлы за межы БССР, але з прычыны таго, што распараджэньне спазьнілася, 6 вагонаў жывёлы накіравана ў Ленінград па стараму парадку рэалізацыі яе пасьля забароны гэтага.

Значыць, абвінавачваюцца вылучэнцы не ў парадку гаспадарчых і палітычных вынікаў для мясцовага рынку, а фармальна за парушэньне распараджэньня акргандлю.

Замест ажыятажу акрсельсаюзу і мясного гандлю, высьвятляецца ажыятаж і скрытае павялічэньне цэн на жывёлу Мазырскім Белмясгандлем, прычым, згодна апублікаваньня у „Белорусском Коммерческом Бюллетене" ад 6 кастрычніка гэтага году, віноўныя у гэтым перадаюцца суду. Між тым Мазырскі Акргандаль ведаў гэта і ня прыняў належных мер, каб сыгналізаваць недапусьцімасьць ажыятажу перад загатоўцамі.

Судовая справа адкладзена да дасьледаваньня ў сувязі з выяўленьнем новых праступленьняў Мясгандлю.

Трэба думаць, што вылучэнцы будуць апраўданы, і, магчыма, іх справа зьвядзецца да таго, што яны пацерпяць маральнае прыгнечаньне ў тым, што іх вылучылі і не заслужана судзілі.

Калі гэта будзе так, дык належыць ударыць па галавацяцтву асобы, якая распачала судовую справу супроць вылучэнцаў.

М. З

„НЯ УЗЬНІМАЙ БУЗЫ".

(Лельчыцкі райён).

У мілашэвіцкім спажывецкім таварыстве да верасьня месяца працаваў у якасьці старшыні член партыі Лапета. Едучы ў Мазыр за таварамі, Лапета часта браў з сабою сваю жонку, аплачваючы ўсе яе праезныя выдаткі (фурманкі, кватэра) за кошт т-ва. Рука „шанованага" партыйца Лапета ня дрогнула адпускаць вялікімі партыямі дэфіцытных тавараў Лельчыцкаму гандляру—Фрыдману. У выніку 8-мінесячнай працы акрамя прадзелак у Лапеты аказалася растрата на 175 руб. Для пакрыцьця гэтай сумы ён выпісаў сабе 175 руб. за сумлішчэньне працы касіра.

Характэрна адзначыць, што аб усіх гэтых злачынствах ведала мясцовая ячэйка партыі, ведаў і райком партыі, але ўсё гэта прайшло так сабе. Калі член праўленьня тав. Вайнблат пачаў узьнімаць пытаньне аб дзеяньнях старшыні Лапета, яго выклікалі ў райком КП(б)Б і сэкратар тав. Галавач загадаў яму „лічыцца з думкай РК і ня ўзьнімаць бузы".

І так усё ўлажана. Вайнблату рот зажалі. Ён ужо маўчыць. Лапета працягвае працаваць загадчыкам грашовай часткі РВК, сэкратар РК Галавач маўчыць.

Слова за Мазырскай РСІ.

Ленінградзкі водпускнік.

Учынкі, якія заслугоўваюць увагі РСІ

Тав. Лаўрыновіч сакратар Аршанскага акрвыканкому. Ён працуе ў Воршы яшчэ мала, але і за кароткі час досыць праявіў сябе ў справе грубасьці, бюракратызму і пратэкцыянізму. Дзякуючы гэтаму Лаўрыновіч і вядомы ў Воршы.

За кароткі час у АВК Лаўрыновіч настроіў супроць сябе ўвесь калектыў супрацоўнікоў АВК сваімі грубымі адносінамі да іх. Ён ня ўмее, альбо ня хоча спрацавацца з працаўнікамі, з калектывам. Слова не скажа служачаму як чалавек. Накінецца, накрычыць, зьняважыць.

Ня так даўно, ён накінуўся на тэхнічнага сэкратара АВК тав. Піотуха. Накрычаў на яго, зьняважыў бяз прычыны перад усімі супрацоўнікамі.

Машыністку Падгурскую ён таксама лаяў і зьневажаў у канцэляры і давёў тую да таго, што яна дзень плакала і падала заяву аб звальненьні.

Каб не хадзіць са свайго сягінэту ў канцэлярыю, ён правёў сыгналізацыю і цяпер па 15 разоў у дзень вызывае да сябе тэхнічнага сакратара і не дае таму магчымасьці працаваць. Ён зрабіў тэхсакратара, нават, сваім пасланцом.

Звоніць. Тэхсэкратар ляціць да начальства. І што там. Вельмі простая справа:

— Паклічце да мяне вартаўніка.— І толькі.

Гэтымі днямі Лаўрыновіч звольніў з працы рэгістратаршу Арлову, сябра саюзу, бяз згоды апошняга, толькі з той прычыны, што бацька Арловай пэнсыянэр страхкасы мае хату. Саюз выступае супроць гэтага. Але што Лаўрыновічу саюз, калі ён адчувае сябе самаўласным гаспадаром. Ён ня хоча лічыцца і з тым, што брат Арловай чырвонафлёцец.

У гэты-ж час ён узяў на працу на пасаду інфарматара Ваньковіча, былога сэкратара Аршанскага райвыканкому.

Не бяда і ў тым, што ў Ваньковіча справы ў РВК былі ня зусім добрыя, і што яго зьнялі з пасады сэкратара. „Для милого дружка и сережка из ушка".

Ён і пэнсію Ваньковічу павялічыў адразу. Стаўка інфарматару—55 руб. у месяц. Усе так атрымлівалі да Ваньковіча. А Ваньковічу адразу далі 75 руб. Спэцстаўку даў яму Лаўрыновіч,—сьмяюцца працаўнікі АВК.

Учынкамі Лаўрыновіча павінна зацікавіцца РСІ.

А. Мілашэўскі.

ПАТРЭБЕН РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ У СПРАВЕ ЗЬНІШЧЭНЬНЯ НЯПІСЬМЕННАСЬЦІ

ВОРША МАЕ ПАТРЭБНЫЯ КАДРЫ ПРАЦАЎНІКОЎ, МАЕ ПАМЯШКАНЬНІ, АЛЕ ЎСЕ ГЭТЫЯ МАГЧЫМАСЬЦІ НЯ ВЫКАРЫСТАНЫ. — У ВОРШЫ НЯМА НАВАТ СТАЛАГА ВУЧОТУ НЯПІСЬМЕННЫХ.—НА РАЙЁНАХ НЕ ВЯДОМА, ДЗЕ БУДУЦЬ ПРАЦАВАЦЬ ЛІКПУНКТЫ. —ПАДРУЧНІКІ ДЛЯ ЛІКПУНКТАЎ ЛЯЖАЦЬ У ГАБІНЭТАХ РАЙІНСПЭКТАРОЎ.

АСЬВЕТНІКІ САМАХВАЛАВІЦКАГА РАЙЁНУ МЯРКУЮЦЬ НАВУЧЫЦЬ 2.000 НЯПІСЬМЕННЫХ. — АДСУТНАСЬЦЬ ПАДРУЧНІКАЎ І ПРЫЛАДАЎ АДЦЯГВАЕ ПАЧАТАК НАВУЧАЛЬНАГА ГОДУ.

Падрыхтоўку да навучальнага году Аршаншчына праспала.

Згодна пастановы ЦК КПБ і ЦВК, у гэтым навучальным годзе трэба ліквідаваць няпісьменнасьць поўнасьцю ў гарадох, савгасах і калгасах.

Але Аршанская акруга ў гэтым годзе не падрыхтавалася належным чынам да правядзеньня гэтай работы.

Аршанская акруга ў працягу летняга часу займалася падрыхтоўкай, складаліся пляны ў акруговым разрэзе, пару разоў абгаварвалася пытаньне аб ліквідацыі няпісьменнасьці на прэзыдыуме АВК. Даваліся дырэктывы па райёнах. Здавалася, што праца павінна была шырока разгарнуцца на сёньнешні дзень і ісьці поўным тэмпам, але-ж на справе зусім ня так.

МАГЧЫМАСЬЦІ НЯ ВЫКАРЫСТАНЫ.

Умовы для 100 проц. ліквідацыі няпісьменнасьці ў самай Воршы ёсьць. Студэнты пэдтэхнікуму, пэдкурсаў, слухачы прафшколы, вучні 9-цігодак і 7-годак, настаўніцтва гораду — гэта кадры, з якімі можна праводзіць шырокую работу.

Памяшканьне таксама ёсьць — для вячэрніх заняткаў у лікпунктах можна скарыстаць школы і клюбы.

На сёньнешні дзень у Воршы працуе шэсьць лікпунктаў, у якіх навучаецца 212 чалавек і тры школы малапісьменных з лікам вучняў 140. Усе лікпункты і школы платныя, грамадзкіх няма.

Сталага вучоту няпісьменных па Воршы няма, а па прыблізным падліку ў горадзе лічыцца няпісьменных каля 500 чал.

Нас, бязумоўна, ня можа задаволіць такая пастаноўка справы і тэмп работы па Воршы, работа там праходзіць занадта марудна, што адзначыў і прэзыдыум Аршанскага гарсавету на сваім пасяджэньні 13-X—29 году.

Студэнцтва, якое павінна зьявіцца штурхачом гэтае справы, да гэтага часу астаецца ў баку, чакаючы загаду ад НКА, (бо яны адміністрацыйна падпарадкаваны НКА. Школы, якія ўзялі на сябе абавязак зьліквідаваць няпісьменнасьць сярод 50 асоб кожная ў парадку сацыялістычнага спаборніцтва, канкрэтнай работы на сёньнешні дзень не правялі. Замест апорнага лікпункту са стаўкай настаўніка, працуе вячэрняя школа, у якой навучаюцца дзеці школьнага ўзросту з дзіцячага прыёмніку. Няпісьменныя навучаюцца па лемантару для дарослых, а малапісьменныя—па чытанцы для другога году навучаньня ў школах сацвыху „Чырвоная Зьмена".

Падагульняючы работу па гораду ў галіне зьнішчэньня няпісьменнасьці, трэба сказаць, што зроблена тут зусім мала. Няма чоткасьці ў самой рабоце, грамадзкія сілы на рабоце ў лікпунктах ані ня выкарыстаны. Трэба ў тэрміновым парадку мабілізаваць студэнцтва Аршанскага Пэдтэхніку, вучняў 7-мігодак і 9-цігодак, настаўнікаў, узяўшы напрамак на разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва ў гэтай рабоце між асобнымі працаўнікамі і школамі. Трэба рашуча паставіць задачу перад усёй грамадзкасьцю аб 100 проц. ліквідацыі няпісьменнасьці ў горадзе, бо магчымасьці для гэтага ёсьць.

РАЙЁНЫ ЯШЧЭ НЯ МАЮЦЬ СТАЛАЙ СЕТКІ ЛІКПУНКТАЎ.

У райёнах справа абстаіць яшчэ горш. Нават падручнікі, атрыманыя для лікпунктаў, яшчэ не разасланы і ляжаць у габінэтах райённых інспэктароў Нарасьветы.

Сетка лікпунктаў па райёнах зусім адсутнічае. Дзе будуць працаваць лікпункты—райённая інкпэктура ня ведае (Багушэўскі, Аршанскі, Горацкі і Мсьціслаўскі райёны). Колькі трэба абслужыць лікпунктамі калгасьнікаў, савгасьнікаў, жанчын-дэлегатак, батракоў і дапрызыўнікаў—райённая інспэктура ня ведае (Багушэўскі і Аршанскі райёны). Адчыненьне работы ў лікпунктах адкладваецца на невядомы час.

Прэзыдыумы райённых выканаўчых камітэтаў не аддаюць належнай увагі справе ліквідацыі няпісьменнасьці.

Член прэзыдыуму Горацкага РВК т. Бажанаў заявіў: „Перад гаспадарчымі і грашовымі кампаніямі, якія мы праводзім, бляднее ўсё іншае, таму палітасьветныя пытаньні ў нас кульгаюць".

Ня лепш адносяцца да гэтага пытаньня і працаўнікі сельскіх саветаў.

Возьмем Багушэўскі с-савет. Там да гэтага часу ніхто ня цікавіўся пачаткам навучаньня ў лікпунктах, выяўленьнем няпісьменных. З боку пасобных таварышоў была думка, каб адчыніць платны лікпункт у м. Багушэве, але яшчэ і на сёньнешні дзень лікпункт не адчынен.

ПРАЦА ПАЧНЕЦЦА НЕ РАНЕЙ, ЧЫМ ВЫПАДЗЕ СЬНЕГ.

Старшыня Панізоўскага сельсавету, Аршанскага райёну, тав. Котаў упэўнен, што ліквідацыя няпісьменнасьці ў яго сельсавеце будзе праводзіцца, але-ж распачаць працу раней, як выпадзе сьнег, ён ня зьбіраецца, бо, як ён кажа, „нічога ня выйдзе, калі пачаць раней". Колькі трэба навучыць няпісьменных, якая будзе сетка лікпунктаў—т. Котаў таксама ня ведае.

Увязаць работу хат-чытальнь з ліквідацыяй няпісьменнасьці ніхто не падумаў, ды і самі хаты-чытальні на сёньнешні дзень у сваёй большасьці ня маюць працаўнікоў.

Камсамол у рабоце лікпунктаў удзелу ня прымае, прафэсыйныя і каапэрацыйныя арганізацыі дапамагаюць фармальна, даючы грашовую дапамогу, а заняцца канцэнтрацыяй грамадзкай думкі навакол гэтага пытаньня і не падумалі.

Арганізацыя таварыства «ПН», якая павінна канцэнтраваць і мабілізаваць грамадзкасьць на справу ліквідацыі няпісьменнасьці, слаба цікавіцца ростам арганізацый у калгасах і савгасах, ня цікавіцца яна і пашырэньнем сеткі лікпунктаў, каб на 100 проц. зьнішчыць няпісьменнасьць сярод савгасьнікаў, калгасьнікаў, батракоў і жанчын-дэлегатак.

Кадрамі ліквідатараў у гэтым годзе будуць зьяўляцца пераважна настаўнікі. Курсы, якія праводзіліся на некаторых райёнах, належна прадрыхтаваных працаўнікоў не далі.

ПАТРЭБЕН РАШУЧЫ ПЕРАЛОМ.

Якія задачы высоўвае жыцьцё перад Аршаншчынай на сёньнешні дзень у галіне ліквідацыі няпісьменнасьці?

Не чакаючы больш ніводнай хвілі, сельскім саветам трэба намеціць сетку лікпунктаў, мабілізаваўшы для гэтае работы ўсіх культурных працаўнікоў вёскі, правесьці з няпісьменнымі адпаведныя гутаркі аб наведваньні лікпунктаў, прыцягнуць усіх, хто зможа працаваць, да практычнай работы ў лікпунктах.

Райённай інспэктуры тэрмінова разаслаць падручнікі па сельсаветам для задаволеньня імі лікпунктаў і дапамагчы сельсаветам у пытаньнях складаньня самой сеткі лікпунктаў.

Правесьці перавыбары ячэек „ПН" і райённых радаў дзеля сканцэнтраваньня грамадзкай думкі навакол справы зьнішчэньня няпісьменнасьці і ажыўленьня практычнай работы т-ва „ПН".

Перад кожнай ячэйкай „ПН" паставіць канкрэтную задачу ў галіне зьнішчэньня няпісьменнасьці.

Правесьці па ўсіх райёнах канфэрэнцыі ліквідатараў, загадчыкаў хат-чытальнь, чырвоных куткоў і актыў т-ва „ПН", дзе абгаварыць пытаньні аб мэтадах работы ў лікпунктах і наогул аб палітасьветнай рабоце сярод асоб, якія навучаюцца ў лікпунктах.

Ульлянін.

Лікпункты без падручнікаў і прыладаў.

(Самахвалавіцкі райён, Менскай акругі).

Няпісьменных па Самахвалавіцкім райёне лічыцца 4560 чал. У парадку сац. спаборніцтва асьветнікі ўзялі на сябе абавязак навучыць у гэтым годзе 1190 чал. Нарада асьветніцкага прафактыву выказала думку за павялічэньне ахопу няпісьменных у грамадзкім парадку да 2000 чал.

Не дае магчымасьці належна разгарнуць працу адсутнасьць падручнікаў і прыладаў для лікпунктаў. У райёне няма ніводнае праграмы як для лікпунктаў, так і для школ малапісьменных. Гэта гаворыць за тое, што Наркамасьветы і БДВ не падрыхтаваліся да навучальнага году. Меркавалася ў райёне распачаць нармальныя заняткі з 1 лістапада, але наўрад ці зможа гэта выканаць Самахвалавіцкі райён.

Сельрабачкомы саюзу рабземлес зусім слаба зацікаўлены справай зьнішчэньня няпісьменнасьці. Ад іх былі затрэбаваны сьпісы няпісьменных батракоў да 15 кастрычніка, але гэтых сьпісаў райінспэктар не атрымаў і да гэтага часу. Гэта можа сарваць поўны ахоп батрацтва лікпунктамі.

З боку часткі асьветнікаў таксама наглядаюцца няўважлівыя адносіны да гэтае справы. Напрыклад, асьветнікі Новадворскага калектыву зусім адмовіліся працаваць на лікпунктах у грамадзкім парадку.

Асьветнікі Самахвалавіцкага калектыву ў грамадзкім парадку працуюць на 6-ці лікпунктах. Асьветнікі Грычынскага калектыву ўзялі на сябе абавязак навучыць па 5 батракоў кожны. Наогул сярод пераважнай часткі асьветнікаў ёсьць гарачае імкненьне дапамагчы ў справе барацьбы з няпісьменнасьцю.

Трэба зрабіць усе захады да тэрміновай высылкі неабходных падручнікаў і праграм і зьшыць недапусьцімыя адносіны з боку саюзу рабземлес і іншых арганізацый, якія зрываюць пачатак навучальнага году на лікпунктах.

П. Лабус.

МАЗАІКА ЖЫЦЬЦЯ.

Больш увагі самым простым, але жывым, з жыцьця ўзятым, жыцьцём правераным фактам камуністычнага будаўніцтва—гэты лёзунг трэба наўстанна паўтараць усім нам, нашым пісьменьнікам, агітатарам, прапагандыстам, арганізатарам...

ЛЕНІН.

Жыцьцё—рэч складаная.

Многа яшчэ ёсьць людзей, якія мысьляць сябе камандзірамі жыцьця, а блізка гэтага жыцьця ня бачылі і ня хочуць бачыць. Глядзяць на схему з лічбамі, з процантамі, з агульнай круглай гладкай фразай і мысьляць, што гэта ёсьць яно сапраўднае жыцьцё з яго барацьбой і будаўніцтвам. Жывуць нібы ўмоўнымі рэфлексамі.

Скажы ім, напрыклад, што зараз ідзе пасьпяховы наступ сэктару сацыялістычнага на сэктар капіталістычны ў сельскай гаспадарцы, што мы ўжо маем поўны процант калгасаў і савгасаў і яны ўявяць сябе: кружок, які знаняе сабой усю сялянскую гаспадарку, а ў гэтым кружку два радыусы, а паміж радыусамі сэктар калгасаў з савгасамі... Радыусы, як жывыя, разыходзяцца, павялічваючы сэктар сацыялістычны і бязьлітасна напіраючы на сэктар індывідуальных гаспадарак, зьнішчаючы кулака...

Усьмешка здавальненьня разальлецца па твару ў гэтых людзей, калі толькі яны па-савецку настроены... Калі і захочацца ім „удакладніць" гэтую схему, дык толькі процантамі, альбо абсалютнай лічбай.

— Вы сказалі «поўны процант», а які гэта процант і колькі гэктараў?

Такое «удакладненьне» патрэбна ім для таго, каб ведаць, калі-ж будзе „на ўсе сто процантаў". Усё другое для іх вразумела:

— Беднаце лепш, кулаку дрэнна.

Ну, а калі гэтыя лічбы слухаў несавецкі чалавек, у яго будзе іншы ўмоўны рэфлекс і твар скосіцца злабой і ён будзе спачуваць кулаку і спадзявацца, што радыусы канчаткова яго не задушаць...

Даруй мне, чытач, за некаторае спрашчэнства!.. Мой вывад:

праз акуляры сводак і данясеньняў, праз руковае шкло сьвяточных прамоў, праз біноклі дутых лічбаў, з бюракратычных каланчэй, вежаў і званіц, праз дымавыя заслоны тэндэнцыйнасьці трэціх і дзесятых «ліц» ня ўбачыш жыцьця ў яго сапраўдным выглядзе, ня ўбачыш тых дробязяй, з якіх, як з рознакаляровых каменчыкаў і чарапочкаў складаецца шматлікая стракатая мазаіка жыцьця...

А значыцца ня зробіш і належнага аналізу, не атрымаеш правільных вывадаў, ня будзеш сапраўдным кіраўніком жыцьця.

На адным з пасяджэньняў тав. К. унёс прапанову, каб у рэдакцыях ніводнай заметкі не заставалася не скарыстанай.

— Трэба з тых заметак, сказаў тав. К., якія ня друкуюцца ў газэце, чарпаць факты, даваць сводкі гэтых фактаў, каб ведаць чым дыхае маса, аб чым яна сыгналізуе. Гэта зусім правільна! Чым больш фактаў, тым грунтоўней вывад, тым, паўней. Сёньня я часткова выконваю гэтую прапанову.

Як карысна праверка!

Але-ж, даручы сказаць, правільнасьць вываду залежыць ад поўнасьці фактаў. Праверка—адна з складаных частак мэтодыкі вывучэньня жыцьця. Каб такі довад хто-небудзь не назваў схэматычным і абстрактным, я падам прыклад. Гэты прыклад зьвязаны з Мазыршчынай.

Быў у мяне адзін сюжэт, на які я зьбіраўся напісаць вялікую аповесьць.

— Хоць раз у жыцьці зьдзіўлю народ,—думаў я, смакуючы гэты сюжэт. А сюжэт быў і сапраўды цікавы.

Дачка буйнага абшарніка, надзвычайна прыгожая сямнаццацігадовая дзяўчына, настаўніца вясковай школы „абкруцілася" савецкім шлюбам з простым вясковым хлапцом, батраком і нават інвалідам. Даручы сказаць, бацька гэтае паненкі з 1918 году сумленна і стала служыць у розных савецкіх установах. Дзяўчынка пазбавілася абставін буйнага панскага маёнтку ў 1917 г., калі ёй было 7 год. Выхоўвалася яна ў савецкай школе, пры некаторай адарванасьці ад сваёй сям'і і пэўных клясавых уплываў...

Ведаючы добра бацькоў «гэраіні», яе саму, я зацікавіўся прычынамі, якія штурхнулі красуню-дзяўчыню на брачны ложак батрака і інваліда. Якое быцьцё вызначыла яе сьвядомасьць? Якія пачуцьці ўплывалі на яе ўчынак? Што зрабілася з тою мяжой, якая аддзяляла яе клясу ад людзей з чорнымі касьцямі? Якія псыха-фізычныя перажываньні даў ёй гэты шлюб?

Ведаючы шмат акалічнасьцяў, у якіх адбылася рамантыка гэтага шлюбу, я не хацеў тлумачыць гэты ўчынак дзяўчыны як вынік простага буйту маладой крыві.

Пытаньне для мяне паказалася настолькі сур'ёзным, што я на мог распачаць вялікай аповесьці без папярэдняй праверкі фактаў. Я спаткаў яе блізкую сваячку, з якой яна праводзіла дзіцячыя гады і гады вучобы, а потым і яе саму. Нават ня зусім „шчырая споведзь" гэраіні дапоўнена „без вранья" сваячкай пераканала мяне ў тым, што мае першыя меркаваньні былі ў корані памылковымі. Вось што дала праверка.

Гэрой раману не батрак-інвалід, а сын моцнага серадняка, прыгожы, здаровы хлапец, сэкратар камсамольскай ячэйкі, які заваяваў паненку ня толькі сваім абліччам, але і „рыцарскай абаронай настаўніцы ад мужыцкіх нападаў". Тры тыдні маладая адмаўлялася ад „супружаскага ложа". А потым пашла, бо былі сьведкі шлюбу і запісь у сельсавеце.

Цяжарнасьць была вялікай памылкай, якую цётка-урач са злабой і агідай ліквідавала. Пасьля гэтага маладая, не шкадуючы, кінула свайго «рыцара»-мужа і зрабілася нявольніцай-жонкай у „свайго поля ягады", каморніка. І з агідай яна ўспамінае цяпер свой першы грэх. Клясавая мяжа засталася на месцы, чакаючы трактараў часу і канчатковай перамогі сацыялізму над аджываючай, але злобна пратэстуючай капіталістычнай і фэадальнай „знацьцю".

Зрабіўшы такую праверку, я міманолі і ў час прыпомніў канец аднаго з сваіх вершаў, напісаных мною ў 1921 годзе.

Песнь моя—оружье мести
Возмутившихся рабов...
Нет в ней звуков сладкой лести,
Нет красивых пышных слов...

Пусть о днях минувшей ломки
Не поют мои потомки
Я же помню ночь...
Нанося врагам удары,
Прошлых дней гоню кошмары
Стопудовую чекухой
Пролетарской оплеухой
Прочь...
Песнь моя—дитя порывов
Буйных сил, родивших новь,
В ней горит огонь призывов
К братьям сёл и городов:

— Черной кости с белой костью
Место рядом на погосте,
Раб же с нами будь!
Мы рассеем рабства тени
Для грядущих поколений
І потомкам скажем строго:
— К счастью сделана дорога—
В путь!

Здаровы інстынкт бяз промаху біў тады ў мэту. Цяпер жыцьцё больш складанае.

Не буду пісаць вялікай аповесьці.

Як карысна праверка фактаў!

Тварам да калгасу.

Зараз я шчыльна падышоў да вясковага жыцьця. Не, ня сеў на сельскую гаспадарку, гэта азначала-б «ўвайшоў у вясковае жыцьцё», а проста прыехаў у Мазыршчыну, у Калінкавіцкі раён, у вёску Гарочычы, Зеляноцкага сельсавету. Знайшоў на канцы вёскі сельска-гаспадарчую арцель імя газэты «Савецкая Беларусь» і назіраю дробязі жыцьця калгасу і акаляючага сялянства...

На двары, куды я заехаў, шэсьць парных фурманак: тры фурманкі з гэтага калгасу, а тры з суседняга калгасу «Чырвоны Сьцяг». Калгасы жывуць дружна, калі зьбіраюцца разам ехаць на сельска-гаспадарчую выстаўку ў Даманавіцкі сельсавет. Праваяраю—правільна, нават есьць думка аб'яднацца. На адной чырвонасьцягскай фурманцы сядзяць музыкі—з бубнам, флейтай і скрыпкай. Сусед рашыў аздобіць урачысты вечар суседа музыкай і, напэўна, скокамі.

А што ўрачысты вечар будзе, ведае кожны калгасьнік і з «Савецкай Беларусі» і з «Чырвонага Сьцягу», бо прыехаў прадстаўнік «Савецкай Беларусі», які прывёз чырвоныя сьцягі і калгасу і школе.

Ветліва сьмяюцца мужчыны і жанчыны—члены калгасаў гасьцём. Можна не сумняваецца—вопраткі на іх самыя лепшыя. Гэта нічога, — што дзетвара шмыгае басанож, і там-сям сьвеціць голымі каленкамі.

— Апрануліся-б яшчэ лепш, калі-б была мануфактура... Ня ўсё-ж адразу, вясною толькі на калгас выйшлі.

Заходжу ў хату. Чырвоны кут завешаны белай фіранкай, але-ж абразоў няма. Правяраю ці так заўсёды.

— Заўсёды,—кажуць,—абразы ліквідавалі.

І на двары і ў хаце толькі члены калектыву. Няма а ні кулака, а ні падкулачніка...

Але-ж чакаць некалі. Трэба на сельска-гаспадарчую выстаўку ў Даманавіцкі сельсавет. Як-ні-як, дзесяць вёрст у адзін канец...

Затуркалі калёсы па вёсцы. На кожнай фурманцы пяць-шэсьць, а то і сем асоб.

А на вёсцы, ля хат і кулакі групкамі з падкулачнікамі. На тварах выразна настрой напісаны.

— Ці бачылі як усьміхнуўся кулачок?—пытаецца мой сусед.

Я якраз бачыў гэтую ўсьмешку селяніна, досыць добра апрануутага. Такую ўсьмешку можна ўбачыць у цырку ў акрабата, які робіць небясьпечны трук дзе-небудзь высока над зямлёю.

Ня ўсьмешка, а гора.

У падкулачнікаў і такога сьмеху няма.

Чаму? Ці таму, што сёньня госьці ў калгасе, што калгас паказаў сваю моц і здольнасьць?

Гэта дробязь. Вывадаў рабіць ня трэба.

А вось і сельсавецкая выстаўка. Ужо здалёку відаць на полі ля соджанага шляху трыбуна і гэктараў пяць абсеяна стракатым натоўпам людзей. Праможуць вітаюць лепшую бядняцка-серадняцкую частку сялянства. Кулацтва няма. Бяз іх неяк атмасфэра чысьцей, неяк папросту хочацца гаварыць з людзьмі, якія парвалі путы старай трохполкі, старай цераспалосіцы, якія разрываюць моцныя яшчэ путы дзедаўскай традыцыі, старога быту і зрабіліся авангардам у барацьбе за новую сацыялістычную вёску.

— Што гэта за гаспадарка, у якой мы спыніліся?

— Авангард...

— Так і называецца?

— Так...

У хлеўчыку трактар. На выстаўцы сярод экспанатаў побач з малатарняй і касілкай—дзьве дапатопных сахі. Яны сёньня чамусьці напамінаюць мне ўбогіх падкулачнікаў.

Жанчыны ў стракатых бе

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

па дакладу Народнага Камісарыяту Фінансаў пра вынікі абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку.

Заслухаўшы даклад Народнага Камісарыяту Фінансаў пра вынікі абкладаньня сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку, Савет Народных Камісараў БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Адзначыць, што ўсе акруговыя выканаўчыя камітэты, асабліва Гомельскі і Менскі, а таксама фінансавы апарат ня ўжылі дастатковых захадаў да поўнага выпаўненьня кулацкіх гаспадарак для абкладаньня іх сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку.

Праверка працы па індывідуальнаму абкладаньню паказала шмат прыкладаў скажэньня акруговымі і раённымі ўстановамі класавай лініі і недаабкладаньня кулакоў. Побач з гэтым нагляднаюцца выпадкі абкладаньня серадняцкіх гаспадарак сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку.

Па ўсіх акругах на 15 кастрычніка за кулакамі застаецца значная недаімчанасьць, прычым меры прымусовага характару ўжыты толькі ў адносінах да часткі гэтых недаімшчыкаў.

2. Запрапанаваць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і акруговым выканаўчым камітэтам безадкладна ўзмацніць працу па дадатковаму выяўленьню кулацкіх гаспадарак, арганізаваць праверку падліку іх сапраўднага даходу, ліквідаваць усе выпадкі абкладаньня серадняцкіх гаспадарак сельска-гаспадарчым падаткам у індывідуальным парадку, ужыць рэпрэсыўныя меры ў дачыненьні да службовых асоб, якія дапусьцілі нядбайнасьць і окажэньне клясавай лініі ў гэтай галіне.

Недаімчанасьць, якая лічыцца па сельска-гаспадарчаму падатку за кулацкімі гаспадаркамі павінна быць спагнана не пазьней 1 лістапада 1929 г., для чаго ўжыць меры прымусовага спагнаньня ў дачыненьні да недаімшчыкаў кулакоў.

3. Абвясьціць вымову прэзыдыумам Менскага і Гомельскага акруговага выканаўчага камітэту, якія ня ўжылі належных захадаў да дадатковага выяўленьня кулацкіх гаспадарак і не забясьпечылі выкананьне мінімальнага заданьня.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Нам. кіраўніка спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнай Нарады БССР Л. ДУБАВІЦКІ.

22 кастрычніка 1929 г.
г. Менск.

Пастанова

Савету Народных Камісараў БССР

пра парадак вылічэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў па каштарысах на 1929-30 г. дзяржаўных органаў, якія дзейнічаюць на аснове камэрцыйнага (гаспадарчага) разрахунку, мяшаных акцыйных таварыстваў і каапэрацыйных арганізацый.

На падставе пастановы СНК СССР „Пра парадак вылічэньня адміністрацыйна-кіраўнічых выдаткаў па каштарысах на 1929-30 г. дзяржаўных органаў, якія дзейнічаюць на аснове камэрцыйнага (гаспадарчага) разрахунку, мяшаных акцыйных таварыстваў і каапэрацыйных арганізацый" (З. З. СССР 1929 г., № 58, арт. 542) Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе:

1. Дзяржаўныя органы рэспубліканскага значэньня, якія дзейнічаюць на аснове камэрцыйнага (гаспадарчага) разрахунку, мяшаных акцыйных таварыстваў і каапэрацыйных арганізацый, павінны рабіць вылічэньне каштарысных прызначэньняў на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі на 1929-30 г. на наступных падставах:

а) у каштарысы на 1929-30 г. не павінны ўключацца асыгнаваньні, прадугледжаныя ў каштарысах на 1928-29 г., на патрэбы, якія меліся толькі ў даным годзе і ня будуць паўтарацца ў наступным годзе, а таксама асыгнаваньні на выдаткі, зьвязаныя з функцыямі перададзенымі іншым прадпрыемствам і арганізацыям;

б) пры складаньні каштарысаў на 1929-30 г. адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі павінны быць у параўнаньні з адпаведнымі асыгнаваньнямі ў каштарысах на 1928-29 г. скарочаны за кошт праведзеных у 1928-29 г. мерапрыемстваў па рацыяналізацыі апарату і ажыцьцяўленьні рэжыму эканоміі, а таксама ў сувязі з адпаведнымі мерапрыемствамі, якія трэба правесьці ў 1929-30 г.;

в) асыгнаваньні на новыя адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі, якія прадугледжваюцца ў каштарысах на 1929-30 г. упяршыню, уносяцца ў каштарысы заграфна звыш выдаткаў, прадугледжаных у 1928-29 г.

Гэтыя новыя асыгнаваньні дзяржаўнымі органамі і мяшанымі акцыйнымі таварыствамі могуць уносіцца ў каштарысы толькі на падставе адпаведных пастаноў заканадаўчых альбо рэгулюючых органаў БССР, а каапэрацыйнымі арганізацыямі—на падставе пастаноў адпаведных, наказаных у іх статутах, органаў;

г) асыгнаваньні на адміністрацыйна-кіраўнічыя выдаткі ў каштарысах на 1929-30 г. не павінны перавышаць, уключаючы асыгнаваньні на новыя выдаткі, адпаведных прызначэньняў у каштарысах на 1928-29 г. Вынятакі з гэтага правіла дапушчаюцца ў дачыненьні да дзяржаўных органаў і мяшаных акцыйных таварыстваў ня інакш, як з дазволу адпаведнага народнага камісарыяту БССР, узгодненага з Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР, а ў дачыненьні да каапэрацыйных арганізацый—па згодзе ўсебеларускага каапэрацыйнага цэнтру з Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР.

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю БССР і народным камісарыятам, пад ведамам якіх ёсьць дзяржаўныя органы, што дзейнічаюць на аснове гаспадарчага разрахунку, а таксама ўсебеларускім каапэрацыйным цэнтрам па згодзе з Народным Камісарыятам Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі БССР выдаць не пазьней як праз тыдзень інструкцыю аб ужываньні гэтай пастановы.

Нам. Старшыні Савету Народных Камісараў БССР М. Карклін.

Нам. Кіраўніка Спраў Савету Народных Камісараў і Эканамічнае Нарады БССР А. Дубавіцкі.

21 кастрычніка 1929 г.
гор. Менск.

Калгасы растуць.

200 новых калгасаў.

(Магілеўская акруга).

Ішчэ год таму назад Магілеўшчына мела ўсяго 181 калгас на плошчы каля 12 тыс. гэктараў, зараз гэты лік „старых" калгасаў паменшыўся да 158, але, затое плошча пад імі ўзьнялася да 30 тысяч гэктараў.

Апошні год прынёс 194 новых калгасаў.

Агульная плошча пад усімі калгасамі складае каля 87 тыс. гэктараў або каля 5 проц. усіх зямель.

Сярэдняя плошча на адзін калгас—250 гэктараў. Калгасаў ад 500 да 1000 гэктараў ёсьць 30, а ад 1000 да 4000 гэктараў 9.

Аб Клімавіцкім раёне, дзе ўжо цэлыя сельсаветы падыходзяць да стопроцантнай калектывізацыі і дзе ў будучым годзе марнуецца калектывізаваць раён цалкам ужо досыць відома.

Калгасны рух пашыраецца, ахопліваючы самыя адгледныя і адсталыя вёскі.

Сёлета каля 70 проц. усяго земляўпарадкоўчага пэрсаналу працавалі па калгасах; у наступным годзе, трэба меркаваць, усе каморнікі будуць заняты выключна на працы па земляўпарадкаваньню калгасаў.

Бадай найвялікшым доказам пераможнасьці калгаснага руху зьяўляецца той факт, што старыя хутары просяцца ў калгасы. Гэтым самым сьведчыцца стыхійнасьць нашага руху, руху сацыялістычнае перабудовы вёскі. Бо калі пры земляўпарадкаваньні вёскі мы агітуем за калектыў, дык у адносіне хутароў гэтага няма. Яны самі ідуць.

КВІК.

Арганізуем трактарную калёну.

ПОЛАЦАК, 24-X. Гэтымі днямі ў гм. Вуле адбылася пашыраная нарада старшынь калектыўных гаспадарак усяго раёну, на якой сталі пытаньні аб хлебазагатоўках і калектывізацыі. Высьветлілася, што калгасы ідуць першымі па калектыўнай здачы хлебных лішкаў у каапэрацыю.

Пасьля гэтага ўдзельнікамі нарады было ўзьнятае пытаньне адносна арганізацыі трактарнай калёны ў раёне. Усе выказаліся за арганізацыю такой калёны. Так-жа было выноситна пажаданьне, каб у калгасе Нізгалава пабудавать крахмальны завод, які мае асаблівае значэньне ў умовах Вульскага раёну.

Падрыхтоўка да Кастрычнікавых урачыстасьцяў.

НА ПАСЯДЖЭНЬНІ ЦЭНТРАЛЬНАЙ КАМІСІІ.

24 кастрычніка пад старшынствам т. Хацкевіча адбылося пасяджэньне цэнтральнай камісіі па падрыхтоўцы да сьвяткаваньня XII гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Былі заслуханы даклады прадстаўнікоў ад Чырвонай арміі, Наркамасьветы, Наркамправы і розных каапэрацыйных арганізацый.

Працаўнік Чырвонай арміі т. Бачароў паведаміў, што ва ўсіх палках і гарнізонах практычна прыступілі да арганізацыі камісій па правядзеньню сьвяткаваньня. Напярэдадні сьвята будуць арганізаваны мітынгі з удзелам шэфаў і розных рабочых арганізацый. Дзеля азнаямленьня маладых чырвонаармейцаў з жыцьцём і працай рабочых будуць арганізоўвацца экскурсіі на заводы і фабрыкі, а таксама наведваньне кватэр рабочых.

Чырвонаармейскія часьці будуць таксама наведваць і сельскія мясцовасьці: калгасы, вёскі.

Наркамасьветы па лініі масавай школы даў указаньні ў працягу 8-10 дзён распрацоўваць тэмы аб Кастрычнікавай рэвалюцыі. Апроч гэтага, кожны школьнік прымае ўдзел у складаньні лёзунгаў, плякатаў, ва ўпрыгожваньні школ і г. д.

Культасьветныя ўстановы, як хатычытальні, нардамы і г. д. арганізоўваюць вечары для сялян з дакладамі па іх аб 5-ігодцы, міжнародным становішчы. Белдзяржкіно дадзены ўказаньні аб падрыхтоўцы адпаведных фільмаў.

Камісія адзначыла, што Наркамасьветы недастаткова распрацаваў плян культурнага абслугоўваньня працоўных у часе Кастрычнікавых урачыстасьцяў, нічога не вядома, што будзе рабіць радыё. Наркамасьветы павінен прыцягнуць да ўдзелу ў падрыхтоўцы мастацкія сілы: для школ трэба выдаць мастацкі плякат; у часе сьвяткаваньня трэба належна абслужыць часьці Чырвонай арміі, павінны быць арганізаваны канцэрты, пастаноўкі. Было-б пажадана наладзіць пастаноўкі трупы Галубка, беларускай дзяржаўнай капэлы, Белмузтэхнікуму.

Наркамгандаль, які павінен быў зрабіць даклад на пасяджэньні камісіі, мерапрыемствах па сваёй лініі, чамусьці ня прыслаў свайго прадстаўніка, у той час, як пытаньне забесьпячэньня рабочых як гораду, так і вёскі некаторымі прадуктамі да сьвята мае вялікае значэньне. З гэтае прычыны камісія не магла атрымаць поўнага малюнку таго, што будзе зроблена ўсімі відамі нашай каапэрацыі ў гэтым напрамку. Аднак, з дакладу прастаўнікоў некаторых каапэрацыйных арганізацый відаць, што да сьвята Кастрычнікавай рэвалюцыі будзе выдана пшонная мука, масла, цукер і інш. Што-ж датычыцца сталовак, дык яны будуць працаваць пасуцынна.

Цэнтральная камісія выказала пажаданьне, каб у справе падрыхтоўкі да сьвяткаваньня прымалі ўдзел шырокія масы працоўных. У зьвязку з гэтым тав. Хацкевіч выказаў думку, каб усе ўстановы і арганізацыі, якія выпускаюць сваю ініцыятыву ў тым ці іншым напрамку—перайменаваньне фабрык і заводаў, розныя адзнакі сьвяткаваньня і г. д.—паведамлялі аб гэтым цэнтральную камісію.

Цэнтральная камісія пастанавіла зьвярнуцца в просьбай да ЦВК даць указаньні мясцом аб утварэньні адпаведных камісій для падрыхтоўкі да сьвята пры ўсіх АВК, РВК, гарсаветах і сельсаветах.

Чарговае пасяджэньне цэнтральнай камісіі прызначана на 29 кастрычніка.

ХРОНІКА.

Мы гатовы.

У сувязі з апошнімі падзеямі на савецка-кітайскай мяжы, дзе кітайская буржуазія на спыненне абстрэльваць нашу варту і рабаваць мірнае насельніцтва, мы, партызаны Чэрвенскага раёну, абяцаем РАБОЧА-СЯЛЯНСКАМУ УРАДУ і правадыру камуністычнай партыі, што заўсёды гатовы выступіць на абарону Кастрычнікавых заваёў і просім савецкую ўладу даць рашучы адпор сусьветнай буржуазіі і запатрабаваць ад кітайскіх мілітарыстаў вярнуць усе страты, якія яны нанесьлі нам.

Партызаны пастанавілі сабраць сродкі на пабудову самалёту „Чырвоны Партызан БССР". Усяго сабрана 25 рублёў і 85 капеек. Чэрвенскія партызаны выклікаюць усіх іншых партызан зрабіць па іх прыкладу.

С.-г. музэй павінен існаваць.

С.-г. музэй пры Цэнтральным Доме Селяніна зьяўляецца саліднай інстытуцыяй, на экспанатах якой дзесяткі тысяч сялян навучаюцца лепшым спосабам гаспадараньня. Зараз музэй мае да 7000 экспанатаў па розных галінах сельскай гаспадаркі, арганізаваны даволі ўдалы і багаты аддзел экспарту, які каштуе каля 7000 руб. За 11 месяцаў дзейнасьці музэю праз яго прайшло 25000 сялян.

Яно і ня дзіва, бо с.-г. музэй зьяўляецца неадрыўнай і неабходнай часткай Дому Селяніна, і Дом Селяніна без існаваньня пры ім такога музэю не апраўдае свайго прызначэньня.

Але зараз мы стаімо перад фактам амаль поўнага спыненьня працы гэтае інстытуцыі. У памяшканьні с.-г. музэю перабіраюцца музэі гістарычны і зоолёгічны. Экспанаты с.-г. музэю складаюцца ў кучу, прыходзіцца ламаць і разбурваць экспартны аддзел, які каштаваў шмат грошай.

Мы ня выступаем тут супроць таго, каб пераносіць у Цэнтральны Дом Селяніна гістарычны і зоолёгічны музэі; але трэба арганізаваць справу так, каб за кошт гэтых музэяў ня спынілася сваёй дзейнасьці каштоўная інстытуцыя.

Мы патрабуем захаваньня с.-г. музэю, які каштуе шмат грошай, і на арганізацыю якога затрачана шмат часу і энэргіі.

Новы старшыня ЦП саюзу Працасьветы.

У сувязі з назначэньнем тав. Платуна Наркомам Асьветы Беларусі, Пленум ЦП саюзу працасьветы абраў старшыней саюзу т. Рычкова С. П.

Тав. Рычкоў да апошняга часу працаваў на пасадзе рэдактара „Палескай Праўды".

За павышэньня цэн зьняты з працы.

Водгук вестак, атрыманых з мястэчка Дараганава, Бабруйскай акругі, загатоўчая арганізацыя „Прадуктцеперапрацоўка" павысіла цэны на бульбу да 96 кап. супроць устаноўленай нормы 48 капеек за пуд. Пастановай Наркамгандлю вінаўныя ў павышэньні цаны на бульбу з працы зьняты.

Побудуем трактарную калёну.

Прэзыдыум беларускага камітэту саюзу харчавікоў па абгаварэньні пытаньня аб пабудове аўтатрактарнай калёны, пастанавіў пачаць збор сродкаў сярод рабочых і служачых.

Пытаньне павінна шырока абгаварвацца ў рабочых сходах.

К-ты ўзаемадапамогі зьбіраюць попел.

ЦК КСТУ даў дырэктыву мясцом шырока разгарнуць кампанію да вясеньняй сяўбы 1930 г. Ставіцца заданьне сабраць ня менш 800000 пуд. попелу і загатовіць 620000 пуд. насеньня. Пракатныя пункты павінны зараз жа распачаць кампанію зерноачышчэньня.

10000 руб. на дапамогу ясьлям.

Цэнтральная Камісія дапамогі дзецям асыгнавала Нар. Кам. Ах. Здароўя 10000 руб. на дапамогу ясьлям Менскай акругі. Апроч гэтага, 800 руб. асыгнавана Акрана на барацьбу з бясспрытульнасьцю дзяцей. Да гэтага часу выяўлены з вуліцы 50 бясспрытульных, якія размешчаны па дзіцячых домах.

Курсы РКК.

Прэзыдыум ЦП Саюзу Тэкстыльшчыкаў пастанавіў адчыніць пры саюзе курсы для работнікаў кантрольных камісій. Курсы разьлічаны на 20 асоб і пачнуць працу 30 кастрычніка.

Вотрубі для БССР.

У 1929-30 гаспадарчым годзе для Беларусі намечана загатовіць на Украіне сем тысяч тон макухі і 10 тысяч тон вотрубей.

Гэтыя прадукты будуць разьмяркованы паміж малочнымі таварыствамі Беларусі.

Гарадзкія канфэрэнцыі рабочых.

Прэзыдыум ЦСПСБ адзначыў, што вопыт правядзеньня раённых канфэрэнцый рабочых зьяўляецца асабліва каштоўным і запрапанаваў акрпрафбюро правесьці ў бліжэйшы час гарадзкія канфэрэнцыі рабочых.

На гэтых канфэрэнцыях будуць абгаварвацца пытаньні аб кантрольных лічбах на 1929-30 год і аб перазаключэньні колдагавораў.

Спаборніцтвы паміж няпісьменнымі.

У бягучым годзе лікпунктамі саюзу харчавікоў будзе ахоплена каля 600 няпісьменных і 300 малапісьменных. Упяршыню арганізуюцца нацыянальныя лікпункты.

Паміж няпісьменнымі практыкуюцца спаборніцтвы на хутчэйшую ліквідацыю няпісьменнасьці.

Фізкультура і спорт.

Скончыліся асеньнія спаборніцтвы.

Асеньнія фізкультурныя спаборніцтвы на першынство г. Менску скончыліся. Фінальная сустрэча па футболу, якая адбылася гэтымі днямі, скончылася з выікамі 6:3 на карысьць „Данамо".

Фізкультурныя брыгады ў вёсцы.

Акруговы Савет Фізкультуры пастанавіў у бліжэйшы час накіраваць у вёскі рабочыя брыгады фізкультурнікаў з менскіх фабрык і заводаў для дапамогі і папулярызацыі фізкультурнага руху.

Перавыбары бюро ФК гурткоў.

З 15 лістапада на Меншчыне пачынаюцца перавыбары бюро фізкультурных гурткоў. Перавыбары будуць праведзены пад лёзунгам уцягненьня дарослых рабочых у гурткі і пашырэньня фізкультурнага руху.

Прызначэньне дырэктара ў ФК тэхнікум.

Дырэктарам тэхнікуму па фізкультуры прызначан тав. Душман, які раней працаваў у ВСФКБ.

Рыхтуемся да зімовага спартыўнага сэзону.

Прэзыдыум Саюзу Гарбароў вызначыў шэраг мерапрыемстваў для ўзмацненьня і падрыхтоўкі да зімовага сэзону па фізкультуры. Для гурткоў закуплена звыш 150 пар лыжаў.

У сувязі з пераводам прадпрыемстваў на бесперапынны рабочы тыдзень саюз запрапанаваў сваім арганізацыям прыстасаваць ФК працу да лепшага абслугоўваньня рабочых.

СПРАВАЧНЫ АДДЗЕЛ.

КАТЫРОЎКА ПАЗЫК НА 24 КАСТРЫЧНІКА 1929 г.

	Куп.	Прад.
1 6 проц. выйгр. паз.	4.97,5	—
Бяспроц. выйгр. паз. 26 г.	128.25	130. 25
Выйгр. пазыка 1929 г. .	100.55	100.95
10 проц. выйгр. паз. 27 г.	25.46	25.56
3-я сялянск. выйгр. паз. 27 г.	5.03	—
Дзярж. паз. узм. сял. гас.	10.41	10.76
1 выйг. паз. індустр. 27 г.	25.30	25.40
2 . . . проц.	25.40,5	25.50,5
2 . . . 6-проц.	25.40,5	25.50,5
11 проц. дзярж. паз. 1928 г. . . .	101.66	101.71
12 проц. рэнт. паз. 1927 г. . . .	104.75	—
11 проц. дзярж. паз. 28 г.	101.59	101.64
12 проц. рэнтная паз. 27 г.	104.68	—

Рабселькоры нам пішуць.

ТАКСАМА „КЛЯСАВАСЬЦЬ".

Старшыня Капаіцкага сельсавету, Калінкавіцкага раёну, гр-н Рыбак пры усякіх выпадках падтрымлівае кулакоў і заможнікаў. Ён з батрацкаю спраўкаю паслаў вучыцца заможную грамадзянку Рашаноўскую (у польскі пэдтэхнікум), дзе яна атрымлівала стыпэндыю. Ён выдае розныя спраўкі кулакам, памагае ім ухіляцца ад рамонту граблі і г. д.

Такіх старшынь нам ня трэба!

Захар Жах.

ЗЬЕХАЛІ З ГЛУЗДУ.

Зембінскія паштавікі (Бягомльскі раён) зьехалі з глузду. Ім здалося, што м. Бягомль пераехала ў Плешчаніцы; ну, а калі так, дык яны пераслалі ў Плешчаніцы ўсю карэспандэнцыю, якая была адрасавана на Бягомль.

Такім чынам, бягомльчане былі некалькі дзён адрэзаны ад сьвету на віне аднаго ці некалькіх галаваногіх.

А.

БАЯВЫ ВОДГУК.

Сяляне вёскі Смаркі, Барысаўскага раёну, унесьлі на абарону СССР 3141 кілёграм жыта.

— Мы ўсе, як адзін чалавек—заяўляюць сяляне—на першаму закліку аддамо на справу абароны сацыялістычнай бацькаўшчыны працоўных ССР ня толькі жыта, але і сваё жыцьцё. Ворагі нашы няхай ведаюць гэта!

Варановічы А. А

ГНІЮЦЬ БУДЫНКІ.

У вёсцы Дзярновічы, Нараўлянскага раёну Мазырскай акругі астаўся будынак былое воласьці. Цяпер ён у безгаспадарчым стане: падрубы абваліліся, страха згніла—вось, вось увесь дом рухне... А РВК глядзіць на гэта скрозь пальцы, ніякіх мер ня прымае, хоць сельсавет аб гэтым і хадайнічаў.

Праведны.

„СВОЯ РУКА ВЛАДЫКА"

Новаабраны член Нараўлянскага сельскагаспадарчага таварыства карыстаецца разам з іншымі служачымі ільнякамі з саду, які належыць таварыству. Пад „загадваньнем" гэтага „дабрадзея" усе служачыя ганяюць племенного жарабца куды каму ўздумаецца. Пайшчыкі ня ведаюць, куды скардзіцца супроць гэткага самавольства і безгаспадарчасьці свайго праўленьня.

Пайшчык.

АСУШЫЛІ БАЛОТА.

У Чырвона-Слабодзкім раёне асушана балота па плошчы да 7000 гэктараў. На мэліярацыю затрачана 35.000 рублёў. Штогод асушанае балота будзе даваць сена на 750000 рублёў. Сяляне вельмі здаволены.

І. Паўлоўскі.

ТАКІМ У КАЛГАСЕ НЯ МЕСЦА.

У калгас імя Вароўскага, Бягомльскага раёну, прымазаўся за рахункавода сын буйнага ўласьніка паравога млына Рыўкінд Ізраіль. Улез дзеля таго, каб набыць выбарчае права і адчыніць сабе дарогу ў вышэйшыя савецкія ўстановы. Ня трэба нам гэткіх „дабрадзеяў".

Свой.

ВУЛЬСКІ РВК НЯ СОЧЫЦЬ ЗА ВЫКАНАНЬНЕМ СВАІХ ПАСТАНОЎ.

У сельсаветах канцэляры знаходзяцца ў хаотычным становішчы (Хоцімскі і іншыя сельсаветы). Скаргі сялян не разглядаюцца цэлымі месяцамі, ляжаць на ўсіх сталах канцэляры. РВК трэба тэрмінова выслаць свайго сэкратара дзеля ўпарадкаваньня спраў у сельсаветах.

М. Фралёў.

20.000 РУБЛЁЎ, ЯК УПЕЧ УКІНУЛІ.

У вёсцы Пацолтава Амсьціслаўскага раёну пабудаваны млын, на які затрачана 20000 рублёў дзяржаўных грошай. Млын стаіць, бо няма пад ім гаспадара. З Амсьціслаўля прыехаў да нас загадчык камбінату, паглядзеў ды назад паехаў, пабашыўшы, што млын будзе пушчана ў ход. Аднак, абяцаньня свайго нявыканаў. Млын стаіць і зараз.

Муха.

КУЛАЦКІЯ ХІТРЫКІ.

Не спадабалася кулацкаму падпявалу Васілю Субцэльнаму з вёскі Дружна плацьць 90 рублёў падатку. Ён падае заяву, каб ад яго адзьняялі сына Мікіту. Калі ж ад яго адзьняялі сына Мікіту, ня будзе служыць у Чырвонай арміі, ня будзе плаціць вялікага падатку. А райзэмкамісія дапамагла Субцэльнаму ў яго справах... ашукваньня ўлады, бо падвел гэты фіктыўны. Старадарослае РСІ, зьвярні на гэта увагу!

Дубец.

ЛЕПШ ПОЗНА, ЧЫМ НІКОЛІ.

Багацеюць заможнікі і кулакі вёскі Насовічы, Зеляноцкага сельсавету з працы батрака Пінтуса Зьмітрака, які працуе без дагавору. А камсамольская ячэйка, сельсавет і рабчком Зеляноцкага сельсавету нічога ня робяць, каб спыніць апэтыты кулакоў на батрацкую нязмоўную працу; аб заключэньні дагавораў яны і ня думаюць.

В. Сергейчык.

„ШТО ХАЧУ, ТО І РАБЛЮ»!

Машычыраў Антось, член Баханьскага сельсавету, Магілеўскага р-ну мае 8 дзесяцін зямлі, каня, 2 карові і іншую маёмасьць.

У часе складаньня сьпісу бедняцкіх, якія падлягаюць аслабаненьню ад сельгаспадатку, ён унёс у гэты сьпіс і сабе.

Калі беднота абурылася гэтым Машычыраў заявіў:

— „Што хачу, то і раблю... Мне ўсё можна!"

Юр.

ПРЫСВОЙВАЮЦЬ САБЕ ПРАВА СУДОЎ.

Камісія па вучоту аб'ектаў ападаткаваньня у Кашэвіцкім сельсавеце, Мазырскай акругі, падзяліла без дазволу райзэмкамісіі 4 гаспадаркі. Сельсавет падалу на тоўкі не перашкаджае, а, наадварот, дапамагае. А РВК маўчыць, гэтым самым згаджаючыся з учынкамі сельсавету.

Прыежджы.

Што слухаць па радыё.

ПЯТНІЦА 25-ГА КАСТРЫЧНІКА.

17-00—Час піанэра і вучня.
17-40—Сялянскі час. Лекцыя ўрача аб паратыфусу.
18-00—Рабоча-Сялянскі Радыё-Унівэрсытэт.
19-00—Беларуская радыё-газэта (лат. аддзел).
20-00—Праверка часу.
20-00— Гадзіна прафработніка.
20-25—Перадача на мове эсэранто.
20-40—Інфармацыя ўраду.
21-00—Этнаграфічны канцэрт.
23-00—Азбука Морзэ.

СУБОТА 26 КАСТРЫЧНІКА.

17-00—Пасьляабедзенны канцэрт.
17-30—Гадзіна абароны краіны і Чырвонай арміі.
18-30—На фронце сацыялістычнага будаўніцтва.
19-00—Беларуская радыё-газэта (юр. аддзел).
20-00—Паверка часу.
20-00—Сялянская вячорка.
21-00—Канцэрт.

НЯДЗЕЛЯ 27 КАСТРЫЧНІКА.

9-00—Шахматы і шашкі па радыё.
9-30—Сялянскі бязбожнік-раніцнік.
10-40—Палітычны і эканамічны агляд за тыдзень.
11-20—Сьпявайце разам з намі.
12-00—Агляд сёньняшніх цэнтральных і мясцовых газэт.
16-30—Рабоча-сялянскі радыё-унівэрсытэт.
17-00—Час актывістаў, работніцы і сялянкі.
17-40—Радыё-газэта „Чырвоная Зьмена".
18-30—Рабоча-сялянскі радыё-унівэрсытэт.
19-30—Літаратурны тыдзень.
20-30—Канцэрт.
23-00—Інфармацыя.

ПАНЯДЗЕЛАК 28 КАСТРЫЧНІКА.

17-00—Сялянская радыё-газэта (з польск. аддзелам).
17-40—Гадзіна калектывіста. Лекцыя па семенаводзтву.
18-35—Гутарка на нацмове.
19-00—Беларуская радыё-газэта (з яўр. аддзелам).
20-00—Паверка часу.
20-00—Рабоча-сялянскі радыё-унівэрсытэт.
21-00—Канцэрт оперэтай музыкі.
23-00—Вывучэньне нямецкай мовы.

Апавяшчэньні.

Пры 20-й школе з 1-га лістапада адчыняецца 8-ая класа на мясцовым бюджэце.

Прыём заяў ад жадаючых залічыцца адбываецца штодня ад 10 да 2 гадзін дню, у канцэляры школы (1-я Лекерта д. № 5).

ДОМ АСЬВЕТЫ.

У пятніцу, а 7 гадз. увечары пачынаюцца заняткі ў кружках і палітшколе для тэхнічных працаўнікоў пры яч. ЛКСМБ працасьветы.

У палітшколе, акрамя палітычных прадметаў будуць выкладацца матэматыка, беларуская і прыродазнаўства, просьба да ўсіх загадчыкаў школ, дзіцячых садоў і г. д. апавяшчаць аб заняткох у палітшколе, тэхработнікам яўка абавязкова.

ПЭДГАБІНЭТ.

1) У пятніцу, 25-га кастрычніка г. г. роўна ў 7 гадзін увечары першы сход сяброў сэкцыі інтэрнацыянальна-клясовага выхаваньня. Яўка настаўнікаў, якія запісаліся ў сэкцыю, абавязкова.

2) У пятніцу, 25-га кастрычніка а 7 гадзіне увечары сход сэкцыі радавога (пазавога) выхаваньня.

Яўка настаўнікаў, якія запісаліся ў сэкцыю, абавязкова.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

КІНО-ТЭАТР „КУЛЬТУРА". З панядзелка 21 кастрычніка „З 1-м красавіком" амэрыканская камэдыя ў 6 частках. Звыш праграмы: культфільм у 3-х частках «ПАЛЯВАНЬНЕ НА ГАРЫЛУ».

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». З панядзелка 21 кастрычніка амэрыканскі фільм „Радыё і леў". Звыш праграмы: кіно-хроніка САВКІНО № 57. Пачатак а 7 гадзіне.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР". З панядзелка 21 кастрычніка „Сэрца Азіі" кіно-нарыс у 6 частках. Звыш праграмы: цікавая камэдыя „Янка піанэр". Каса адчынена ад 2 гадз.

КІНО „ПРАЛЕТАРЫ". Новы фільм вытв. „Савкіно" „Каін і Арцём" драма ў 6 частках. Пачатак а 7 г. 15 хв.

БЕЛАРУСКАЯ К-РА АКЦ. Т-ВА „САЮЗХЛЕБ" І БЕЛКААПСАЮЗ абвяшчаюць для ведама ўсіх установаў, прадпрыемстваў, арганізацый і ўсіх грамадзян, што ПРЫЁМКА МЯХОЎ ЗА ПЛАТУ ПА ЎСТАНОЎЛЕНЫХ ЦЭНАХ ВЫТВАРАЕЦЦА ва ўсіх пунктах Саюзхлеба і каапэрацыйных крамах, складах і пунктах.

СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА НА ГАЗЭТУ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ" НА ЛІСТАПАД МЕСЯЦ І ДАЛЕЙШЫЯ ТЭРМІНЫ.

Беларускі Дзяржаўны Санітарна-Гігіенічны Інстытут (Менск, Чырвонаармейская 14) даводзіць да ведама зацікаўленых установаў і прыватных асоб, што ІНСТЫТУТ ПЕРАЙШОЎ НА БЕСПЕРАПЫННЫ ТЫДЗЕНЬ Прымаюцца для аналіву: 1) вада для тэхнічных і піцьцёвых мэтаў; 2) харчовыя прадукты; 3) тэхнічныя матар'ялы, як-та: дрэва, тэхнічнае масла, мазі, усялякія гатункі мыла, палуда і г. д. і вырабляюцца цітравыя растворы і спэцыяльныя рэактывы. Плата па таксе, асобай умове і дагаворам. Прыём аналізаў ад 9 да 15 г. штодзённа. ІНСТЫТУТ

„МАЛАДНЯК" літаратурна-мастацкая і грамадзка-палітычная часопісь, орган БелАПП. ВЫШАЎ з друку № 9. ЗЬМЕСТ: П. Труо.—Чырвоныя ружы (вір, паэма). Рыгор Кобец.—Гута (п'еса). Пятрусь Броўка.—Рапарт (паэма фактаў). Сымон Баранаў.—На забрэзках зямлі (аповесьць — працяг). Тарас Хадкевіч.—Чытальня (верш). Яго-ж.—Да таварышоў (верш). Андрэй Курцы.—Лідэры (апавяданьне—пераклад з латыскага). В Казлоўскі.—У Крыме (верш). Сьцяпан Сямашка.—Зьмітра (апавяданьне). КРЫТЫКА: Міх. Аляхновіч.—Творчы шлях Паўлюка Труса. А. Гародня.—Фармалістычны „фокстрот і „самабытная" лявоніха. Іс. Цьвікевіч.—Пяць год культурнае працы. А. Друскоўскі.—Творчы шлях Бруно Ясеньскага. КНІГАПІС. Хроніка. „МАЛАДНЯК" маецца у продажы ва ўсіх кнігарнях Белдзяржыдавецтва, кіёсках, контрагентцтвах друку, аддзяленьнях пошты і Белкаапсаюзу. Выдавецтва ЦК ЛКСМБ „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА" № 9. ЦАНА №—40 к. УМОВЫ ПАДПІСКІ: 1 м. 30 к. 3 м. 90 к. 6 м. 1 р. 60 к. 12 м. 3 р. АДЧЫНЕНА ПАДПІСКА НА 1930 ГОД. Падпіска прымаецца ў паштовых канторах і аддзяленьнях лістаносцамі, упаўнаважанымі „Чыра. Зьмены" пры яч. ЛКСМБ, у кнігарнях Белдзяржыдавецтва і канторы выдавецтва ЦК ЛКСМБ—„Чырвоная Зьмена" (Менск, Камсамольская, 25). СЬПЯШАЙЦЕСЯ ПАДПІСАЦЦА

Нарсуд Азарыцкага р-ну Мазырскай акругі на падставе прысуду за 18 верасьня 1929 г. па 1 ч. 213 арт. за дрэннае хаваньне дубіну сабранае ад школьнага вучастку абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне загадчыку Азарыцкай 7-мігодні Савановічу Даніілу Іванаву.

Народны суд г. Віцебску на падставе прысуду за 5-IX г. г. і арт. 237 КК за нанесьнье зьнішчэньні гр. Шульман Хане абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Крычук Воры Алексеўне і Крычук Хведару, жыхарств. у г. Віцебску па Біржавой вул. № 3.

Народны суд гор. Віцебску на падставе прысуду за 29 жніўня г. г. і арт. 136 КК за дачу ложных паказаньняў па справе гр. Лахэра, абвяшчае грамадзкае ганьбаваньне гр. Ронімсон Рахілі Барысаўне, жыхарст. у г. Віцебску па Лучоскай вул. № 120, і гр. Белецкай Хае Майсеўне, жых. Кавальская вул. № 1.

Народны суд гор. Віцебску на падставе прысуду за 24 жніўня г. г. і арт. 224 КК за несьвядомае нанесьнье цялеснага пашкоджаньня гр. Пракофьев